

KRUG
№ 1
04.1996

БЕЛАРУСКАЯ ПРАВААБАРОНЧАЯ ГАЗЕТА
БЕЛОРУССКАЯ ПРАВОЗАЩИТНАЯ ГАЗЕТА
BELARUSSIAN HUMAN RIGHTS NEWSPAPER



ЧЫРВОНА-КАРЫЧНЕВЫЯ



У гады другой сусветнай вайны мы мелі зайздросную ўпэўненасць, што няма нічога болей небяспечнага для чалавецтва, чым нямецкі фашызм. Пасля перамогі рабіліся магутныя высілкі для яго выкаранення найперш са свядомасці найперш заходніх немцаў, жыхароў ФРГ. Той мэце, апроч іншага, служыла мастацтва і літаратура Еўропы і Амерыкі. Тады ўсе мы падазрона ўзіраліся за жалезны занавес, сачылі за кожнай праявай рэліктавага нямецкага рэваншызму, мала заклапочаныя тым, што рабілася за ўласнай спіной. Дзівоснае асляпленне перамогай, абмежаванасць палітычнага бачання не далі адразу зразумець брутальную сутнасць роднага сацыялістычнага ладу. Некаторае падабенства фашызму і камунізму здавалася нам выпадковым, гвалт у адносінах да народа – класава абгрунтаваным, самазабойчая ядзерная канфрантацыя быццам бы адбывалася не па нашай віне. Вядома ж, па віне англа-амерыканскіх імперыялістаў. Гэткім чынам свет падышоў да бездані ядзернай катастрофы, і, можа, тады мы пачалі па-сапраўднаму разумець, што з намі здарылася.

Спантанная роднасць двух, здавалася б, супрацьлеглых пачаткаў -- нямецкага фашызму і савецкага камунізму – цяпер ужо стала відавочнай. Дыялектычнае адзінства іх раскрылася ва ўсёй іх красе, і мы спазнела пачынаем задаваць сабе пытанне: а ці такія ўжо яны і процілеглыя, гэтыя пачаткі? Нават на сімвалічным, знакавым узроўні чырвонае і карычневае ў каляровым спектры ляжаць побач і адрозніваюцца хіба што адценнем; аднолькава чырвоныя сцягі розныя хіба што ў дэталях – свастыкай у адных ды сярпом з молатам у другіх.

Галоўнае ж, што робіць блізнятамі тыя сістэмы, гэта стаўка на грубую фізічную сілу, ідэялагічная нецярпімасць, неверагодна гіпертрафіраваныя функцыі карных органаў НКУС - гестапа. Але, можа быць, самае важное тое, што ў адносінах тых ды іншых ляжыць ідэя сацыялізму, вядома ж, далёка не з чалавечым тварам. Спосабы ажыццяўлення яе таксама падобныя: імперскія войны і сусветная рэвалюцыя, што аднолькава значыць – кроў, гвалт, галеча. Такім чынам адбываецца ідэйнае і практычнае паяднанне дзьвух некалі варожых сістэмаў, пэўнае сціранне розніцы паміж імі. Хіба з тым адрозненнем, што пяцьдзесят год таму адна з іх парамагла другую. Але перамогшы, старанна засвоіла яе ідэёва-практычную спадчыну.

Дашчэнту дэскрыдытаваўшы сябе ў ідэялогіі, эканоміцы і палітыцы, камуністы хапаюцца цяпер за апошнюю магчымасць самазахавання -- імперскую ідэю, якую не здолеў ажыццявіць нават Гітлер. У той час, як усе іншыя імперыі на зямлі рушыліся (апошняй рухнула ў Афрыцы імперыя Бакаса), у нас робіцца драматычная спроба рэанімацыі савецкай імперыі. Пакуль не позна. Пакуль канчаткова не панішчана ракетна-ядзерная зброя, не страціў сталінскую вывучку савецкі генералітэт, не ўмацаваліся межы паміж нядаўнімі саюзнымі рэспублікамі. Пакуль у тых рэспубліках не зніклі "пятыя калоны", дужа заклапочаныя не так правамі чалавека, як праблемаю рэінтэграцыі.

Зрэшты камуна-фашызм не грэбуе і задачамі болей сціплага маштабу – маленькімі перамогамі на ўскраінах былой імперыі, блізкага замежжа, няўстойлівыя рэжымы якіх у сілу розных прычын (найперш эканамічных) не могуць дасюль выбавіцца з учэпістых імперскіх кіпцюроў. Няважна, што тыя лакальныя войны (накшталт Афганскай, Таджыкскай або Чачэнскай) не прыносяць ім бліц-перамогі, затое яны дазваляюць выканаць ролю перманентнай "вучэбкі", праз якую рэгулярна праганяецца асабовы склад войска, ажыўляюць змарнелы ВПК, нясуць генералам рэгулярны ўраджай зорак і ордэнаў, мацуюць ваяўнічую ментальнасць зласлівых, згаладнелых мас.

Атмасфера няспыннай узброенай барацьбы (як нядаўна асаджанай крэпасці) мацуе дыктатарскія рэжымы, дае ім спадзяванне на вяртанне пад звыклы імперскі дах. Асабліва, калі іншага выйсця з татальнае крызы яны не ведаюць ці не хочуць ведаць. Іншыя з камуністаў жвава падладкоўваюцца да сацыял-дэмакратыі, хапаюцца за ідэйную архаіку панславізму, лёгка перацякаюць у паўлегальны камуна-фашызм, традыцыйна ўцягваючы ў сваё смярдзючае русла люмпенізаваныя ды маргінальныя пласты насельніцтва. Здаецца, у тым апошні шанец і сусветнага камунізму. Але драматызм сітуацыі заключаецца ў тым, што і для спазнелай нацыянал-дэмакратыі канец XX стагоддзя таксама ўяўляе ці не апошні шанец. Вось гэтыя шанцы і сышліся разам, каб штосьці назаўжды вырашыць.

Горш за ўсё, што наша дэмакратыя па-сутнасці не мае адэкватных сродкаў барацьбы з гэтаю чумой XX стагоддзя. Традыцыйна дэмакратычныя, парламенцкія спосабы амаль не дасягаюць мэтаў, выбары фальсіфікуюцца, рэферэндумы з часоў III рэйха даюць спрэс запланаваныя іхнімі арганізатарамі вынікі. На разумную дэмакратычную аргументацыю ўлады адказваюць звыклым для іх спосабам: забаронай, рэпрэсіямі, сілай. Ва ўмовах пракамуністычнай заканадаўчай улады, гэткай жа выканаўчай і кішэннай судовай апошняя надзея дэмакратыі прыпадае на галоснасць, на сродкі масавай інфармацыі. Але і тыя з іх, нешматлікіх, што хочуць застацца свабоднымі, выкараняюцца ўсімі спосабамі -- ад фінансавых да паліцэйскіх.

Грамадства па-сутнасці не мае эфектыўных процівагаў камуна-фашызму. Разбураецца эканоміка, бяднее народ, гіне культура, затое, бы на дражджах, растуць розныя ахоўна-паліцэйскія фармаванні, на якія выдаткоўваюцца велізарныя сродкі, -- бы ў якой-небудзь з Лаціна-Амерыканскіх дыктатур.

У вайсковых і камуністычных калонах лунаюць чырвоныя сцягі, а гістарычная нацыянальная сімволіка забаронена. Прэзідэнт краіны займае паслядоўную пазіцыю на здачу суверэннасці ў карысць суседняй дзяржавы -- выпадак сапраўды беспрэцэдэнтны ў сусветнай гісторыі. Збіты зпанталыку народ перастае разумеець, што адбываецца. Самае дзівоснае, што ў масавай свядомасці гэты рэжым ідэнтыфікуецца як дэмакратычны, які прыйшоў на змену звыкламу і нават міламу для некаторых камуністычнаму. Толькі нешматлікія людзі разумеюць , што адбываецца банальная рэч -- імперскае паяднанне чырвоных з класічна карычневымі.

ДЗЁННІК РЭДАКТАРА

ЛЯВОН ЛЯВОНІХУ РАЗЛЮБІЎ

У рэдакцыю зайшоў чалавек і сказаў: "Хочаце загадзя ведаць рэпертуар вялікага дзяржаўнага канцэрта з нагоды завяршэння вялікага беларускага даўгабуда – прэзідэнцкага палаца культуры?" – "Хачу." – "Нам зноў раскажуць, што бярозы і сосны гэта партызанскія сёстры і што Лявон Лявоніху любіў, чаравічкі ёй купіў."

От язва!

Сапраўды, быў і я нядаўна ў тэатры з нагоды дзяржаўнага свята. Харысты спелі Лявоніху з аўтаматызаваным майстэрствам, публіка паслухала з раўнадушнай ветлівасцю, чакаючы нечага новага. Ды вядучы зноў паведаміў: Лявоніха. Танцавальны варыянт.

На наступны дзень я сустрэў знаёмага з культурнай установы, дзе складаюцца праграмы вялікіх канцэртаў, і спытаў, чаму не паказалі арыю Лявоніхі з оперы "Лявон Лявоніху разлюбіў". Знаёмы зразумеў сарказм і пагадзіўся, што з нацыянальнай гераіняй айчыннай сцэны перастараліся і што трэба паказваць беларусам новых жанчын, напрыклад, Ліку, у якой душа таксама ласкавая.

Да нашай размовы далучыліся два культработнікі. Яны былі паклоннікамі неўміручай Лявоніхі. Адзін нават дачку так назваў. Абодвум спадабалася мая ідэя Лявоніхіяды, мужчыны пачалі трызніць канцэртам, складзеным песнямі, танцамі, опернымі, балетнымі і тэатральнымі эпізодамі з жыцця жанчыны ў чаравічках ад Лявона. Я паведаміў, што спяшаюся дамоў ствараць дакументальную аповесць пад назвай "Вечныя абцасікі".

У аповесць пра вечны абутак беларусаў я абавязкова ўстаўлю сюжэт з гумовымі ботамі, які пачнецца вясной у маёй вёсцы, дзе зноў разлілася вялізная лужына, затапіла вуліцу і гароды. У нядзелю каля лужы сабраліся пяцёра мужчын-гаспадароў затопленых гародаў, сталі разам думаць, як спусціць ваду. З чатырох асноўных напрамкаў свету яны не змаглі выбраць таго, куды пацячэ вада. Спрачаліся паўдня, плюнулі ў лужу, пабралі рыдлёўкі, пайшлі дахаты. Сярод іх быў і мой бацька.

Вечарам, як сцямнела, бацька сказаў, каб я ўзяў ліхтарык і ішоў да лужыны. Я пасвяціў, бацька нешта хутка прадзёўб рыдлёўкай. Мы пачулі, як у цемнаце светла зацурчэла вада, зыходзячы ў недалёкі лужок, вызваляючы нашу вуліцу ад гразі, а мае ножкі ад абрыдлых гумавікоў.

Пазналі беларусаў? Сабраўшыся гуртам, яны гатовы хутчэй сесці ў лужу, чым асушыць яе. Або калектыўна любіць адну Лявоніху, быццам у Беларусі няма цудоўных жанчын. Што яшчэ могуць зрабіць беларусы, калі іх болей, чым тры? Калі ім добра заплоцяць, могуць асушыць усе балоты, лясы, лугі, гароды, калодзежы і засыпаць іх пяском. Калі іх добра застрашыць, могуць калектыўна любіць не толькі адну жанчыну, але і аднаго мужчыну. Калі ім нешта паабяцаць, могуць стварыць калгасы, пабудаваць сацыялізм, правесці рэферэндум. Калі ім сказаць праўду пра іх калектыўную дурноту, то абавязкова ўзненавідзяць таго праўдалюбца і назавуць яго фашыстам.

Чаму беларус у натоўпе (масавы беларус) робіць гэтулькі крыўды сам сабе і сваёй зямлі?

Вы спытаеце: а француз – не робіць тое самае? Ці немец, амерыканец, кітаец, калі яны збіваюцца да натоўпу?

Так, у статку ўсе дурнейшыя, чым кожны паасобку. Усе нацыі ва ўмовах калектыўнага псіхозу аднолькава бязлікія. Але ж французы сваім французскім натоўпам стварылі Рэспубліку! Амерыканцы калетыўным амерыканскім розумам дайшлі да Дэкларацыі аб Незалежнасці! Масавыя немцы пакаяліся за грахі сваіх продкаў, спарадзіўшых нацыянал-сацыялізм! А што аналагічнага, гістарычна параўнальнага, зрабілі беларусы?

Нарэшце вы ўспомнілі: беларусы ўсе як адзін падняліся ў 1941-м супраць тых немцаў, за якіх пакаяліся зараз іх дзеці і ўнукі. Хіба не прыклад беларускай згуртаванасці, у выніку чаго атрымалася не дурнота, а свабода!

Я не буду аспрэчваць свабоду 1945-га, бо я – яе прадукт. У 1945-ым мае бацька-маці, беларускія остарбайтэры, вярнуліся з нямеччыны дамоў; 7 лістапада, у дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі, было іх вяселле; праз вядомы тэрмін, у 1946-ым, у іх нарадзілася дзіця любові, свабоды, перамогі, вялікай рэвалюцыі і ўсепранікальнай хлусні.

У 1965 годзе, да 20-годдзя перамогі, я напісаў нарыс у газету "Маяк коммунизма" пра аднавяскоўца партызана. Дзядзька Сцяпан расказаў, а я старанна запісаў, як самааддана ён змагаўся за айчыну ў партызанскім атрадзе.

У 1995-ым, пасля свята 50-годдзя перамогі, мне надарылася быць у роднай вёсцы. Да мяне, на бацькоўскую сядзібу, прыдыбаў 90-гадовы дзед Сцяпан і сказаў: "Слухай, хлопец, чаму я стаў партызанам".

Тады, у вайну, ён жыў на хутары. Аднойчы да яго зайшоў савецкі лётчык. Самалёт збілі немцы, лётчык прабіраўся на ўсход, за лінію фронту. Хутаранін пакарміў чырвонага сокала, сабраў на дарогу, даў апратку. Той падзякаваў і на развітанне параіў: "Ты, бачу, чалавек смелы і добры. Але ў цябе дзве каровы, конь і сячкарня. Калі вернецца савецкая ўлада, а яна абавязкова вернецца, перамога будзе за намі, цябе раскулачаць, пашлюць на Салаўкі. Таму дапамагай партызанам. Вазьмі даведку, што дапамагаў. Пакажаш саветам -- і цябе не раскулачаць."

(Заканчэнне на с.2)

ЛЯВОН ЛЯВОНІХУ РАЗЛЮБІЎ

(Заканчэнне. Пачатак на с.1)

Дзед Сцяпан выканаў, як сокал параіў, -- і на Салаўкі яго не паслалі, хаця сячкарню, карову і каня забралі ў калгас.

Напрыканцы вялікага жыцця дзед Сцяпан вырашыў сказаць праўду аб сваёй вайне з немцамі. Пяцьдзесят гадоў ён паўтараў тое, што чытаў у газетах, чуў па радыё. Хлусіў, таму што хлусіла дзяржава і падуладны ёй натоўп. Баяўся праўды, бо праўду дзяржава карае, а натоўп топча. Мучыўся, бо разумеў, наколькі ён, Сцяпан, вышэй дзяржавы і натоўпу.

Не ведаю, ці расказваў дзед Сцяпан каму-небудзь тое, што расказаў мне. Ведаю толькі, што да журналіста ён прыйшоў не выпадкова. Дзед Сцяпан хацеў, каб ягоную праўду я паведаміў людзям.

Зафіксую ў праваабарончай газеце гістарычны факт: вялікую перамогу над вялікай айчыннай хлуснёй дзед Сцяпан здзейсніў у жніўні 1995 года ў 90-гадовым узросце. Раней не мог, раней баяўся дзяржавы і натоўпу.

Ён перадаў мне сваю праўду і свой страх. Я баюся, што ветэраны адкінуць Сцяпанаву Праўду з абурэннем і нянавісцю, а мяне абвінавацяць у паклёпе на свяшчэнную вайну.

Тады навошта Праўда, калі захаваўся Страх? Тады спытайце сябе, ветэраны: а ці адбылася Перамога?

Для большасці беларусаў, сучаснікаў-паплечнікаў дзеда Сцяпана, сапраўдная Перамога ніколі не прыйдзе. Па-першае, многія памерлі, памерлі ў вялікай нястачы, не дачакаўшыся жыццёвых даброт, законных і лагічных для пераможцаў. Па-другое, надта многія пераможцы 1945-га, дажыўшы да 1996-га, засталіся, як кажуць генералы, у страі, а мы скажам больш канкрэтна, -- у адурманеным натоўпе, над якім дагэтуль лунае жоўты партрэцік Сталіна. Па-трэцяе, дзяржаўная прапагандысцкая машына, заведзеная Сталіным, працягвае штампаваць міф аб "масавым гераізме беларусаў у Вялікай Айчыннай вайне", ігнаруючы тое, што айчыны ў беларусаў не было (калі б была, то аддзячыла б за подзвіг), а вайна ў кожнага была асабістая, як у дзеда Сцяпана, як у ягоных аднапалчан.

Вось і дзядзька Мікалай нядаўна, на падпітку, вядома, расказваў мне, як памагаў па чарзе то немцам, то партызанам. Ноччу ў вёску прыходзілі партызаны, пад дулам загадвалі хлопцам браць пілы і валіць нямецкія тэлефонныя слупы. Днём прыходзілі немцы, пад дулам загадвалі хлопцам браць сякеры і ставіць новыя слупы. Дзядзька Мікалай пажартаваў, што не разумее, чаму ад адных ён атрымаў медаль, а ад другіх – не.

На гэтакі жарт здольны сапраўды свабодны чалавек. Свабодны ад страху перад дзяржавай і ад нянавісці да даўняга ворага. Чалавек, які бачыць у беларускіх бярозах і соснах не толькі партызанскіх сёстраў, але і проста лес, які трэба берагчы ад экалагічна яграматнай дзяржаўнай эканомікі. Каб дзядзьку Мікалая не абвінавацілі ў непатрыятызме і пацыфізме, дадам да яго партрэта яшчэ штрышок: ён ваяваў на фронце, быў паранены, мае некалькі ордэнаў, якія жартаўліва называе мядалькамі.

Чым часцей беларусы будуць жартаваць аб сваёй гераічнасці ў гады мінулай вайны, тым хутчэй вызваляцца ад прыгнёту таталітарнай прапаганды, якая збівае іх у агрэсіўны натоўп. Каб панаваць над натоўпам, таталітарны рэжым звязвае яго простай, зразумелай дэбілу, патрыятычнай ідэяй. Беларусаў, якіх не яднае нацыянальная ідэя, сёння можна звязаць толькі адным трукам – зноў і зноў вяртаць іх да "гераічнай ваеннай старонкі", падтрымліваць у беларускім лесе партызанскі дух і вэрхал. Не адпускаць вайну ў гісторыю.

На дзіравых калгасных фермах, на непрацуючых заводах, у жабрацкіх інстытутах і школах адноўлены "чырвоныя куткі". Першыя выступленні палітінфарматараў прэзідэнцкай вертыкалі прысвечаны подзвігу беларускага народа на вайне.

Усе ўлады любяць вайну. Ваяваць – значыць кіраваць шэрай масай, дзе няма твараў, лёсаў, жыццяў. Тым Лявонам, што пасля вайны застануцца жыць, улады прапануюць Лявоніху, душу ласкавую.

Усё! Лявон Лявоніху разлюбіў. Паклаў вока на Ліку, я сам бачыў.

Калі ў вас іншыя звесткі, заходзьце ў рэдакцыю газеты "Круг". Пагаварыць трэба шмат аб чым. І сумленна.

Анатоль КАЗЛОВІЧ

ЗАЯЎЛЯЕ БЕЛАРУСКІ ХЕЛЬСІНКСКІ КАМІТЭТ



Міжнародны Хельсінкскі рух узнік пасля Еўрапейскай канферэнцыі ў Хельсінкі (1975г.) і ахоплівае ўсе кантыненты. Яго мэта – бараніць правы чалавека.

Недзяржаўная рэспубліканская арганізацыя па абароне правоў чалавека – Беларускі Хельсінкскі Камітэт – зарэгістравана ў лістападзе 1995 года. У яе складзе юрысты, псіхолагі, журналісты, палітолагі, пісьменнікі, вайскоўцы – звыш 50 чалавек.

Пры БХК дзейнічаюць 10 камісій: свабоды слова і друку (узначальвае К. Шэрман), па праблемах ваеннаслужачых (А. Сакалоў), пенітэнцыарная (В. Філіпаў), свабоды веравызнання (Ю. Быкаў), палітычных рэпрэсій (В. Вяргей), лінгвістычная (І. Саверчанка), па пытаннях працоўнага права (А. Хількевіч), па правах дзяцей (Н. Грыгор'ева), па правах жанчын (Н. Стужынская), палітычных і грамадзянскіх правоў (Л. Баршчэўскі).

Старшыня Назіральнага сойму БХК Васіль Быкаў. Старшыня Рады БХК Таццяна Процька.

Тэлефон БХК: (0172) 68 55 55.

ПРАВА НА РОДНУЮ МОВУ

Беларускі Хельсінкскі Камітэт выказвае сваю занепакоенасць тым, што згодна з загадам № 439 ад 15 лістапада 1995г. у пераліку абавязковых выпускных экзаменаў за курс сярэдняй школы адсутнічае экзамен па беларускай мове (пісьмова), у той час як уведзены абавязковы пісьмовы экзамен па рускай мове. Гэтае рашэнне супярэчыць духу і літары Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Законам "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь", "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь". Апроч таго, яно стварае Міністэрству адукацыі і навукі славу ведамства, якое аднаўляе русіфікатарскую палітыку, што праводзілася на Беларусі на працягу апошніх двух стагоддзяў.

Лічым неабходным заявіць, што рэальнае раўнапраўе беларускай і рускай моў патрабуе змены названага нарматыўнага дакумента у самы бліжэйшы час.

2 лютага 1996г.

ПРАВА НА МІТЫНГ

28 лютага гэтага года ў Мінску павінны былі адбыцца шэсце працоўных аўтасельмаша і радыёэлектроннай прамысловасці і мітынг на плошчы Незалежнасці ля будынка Дома Урада. Заява на правядзенне гэтага мерапрыемства была своечасова і ў прадугледжанай законам форме пададзена ў Мінскі гарвыканкам. Мінгарвыканкам сваім рашэннем № 120 ад 21.02.1996 забараніў правядзенне мерапрыемства, парушыўшы пры гэтым заканадаўства. У пункце 1 гэтага рашэння ў якасці падставы для забароны згаданы Пастанова Кабінета міністраў Рэспублікі Беларусь і рашэнні Мінгарвыканкама без спасылак на тое, якія палажэнні гэтых дакументаў могуць быць парушаны ў выніку правядзення запланаванага мерапрыемства. Гэтым парушаецца пункт 7 "Палажэння аб парадку арганізацыі і правядзення сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў і дэманстрацый", прынятага Указам Прэзідыума ВС БССР 04.04.1988, якое дазваляе выканкамам мясцовых Саветаў забараняць сходы, мітынгі, вулічныя шэсці і дэманстрацыі толькі ў тым выпадку "если их проведение... угрожает общественному порядку и безопасности граждан". Пункт 6 гэтага ж Палажэння абавязвае выканкамы забяспечваць неабходныя ўмовы для правядзення сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў і дэманстрацый.

У рашэнні Мінгарвыканкама ад 21.02.1996 таксама запісана: "считать преждевременными заявленные шествия и митинг". Гэтым самым груба парушана заканадаўства аб прафесійных саюзах і грамадскіх арганізацыях, якое дае ім самастойнасць і незалежнасць ад органаў дзяржаўнай улады ў межах, прадугледжаных іх статутамі.

Сваім рашэннем Мінгарвыканкам парушае і правы грамадзян Беларусі "на свабоду мірных сходаў", прадугледжаную артыкулам 21 "Усеагульнай Дэкларацыі правоў чалавека" і шэрагам іншых міжнародных актаў, падпісаных Беларуссю.

29 лютага 1996г.

ПРАВА НА СВАБОДУ

Беларускі Хельсінкскі камітэт выказвае пратэст супраць неправавых дзеянняў намесніка кіраўніка адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь У.П. Замяталіна, які распачаў шырокі працэс падрыхтоўкі дасье на навукоўцаў-гуманітарыяў. Змест дырэктывы, што за ягоным подпісам даслана кіраўнікам грамадска-гуманітарных інстытутаў (усяго 17), з патрабаваннем падаць да 7 сакавіка 1996 года ў адміністрацыю Прэзідэнта спіс выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў паводле адмысловай формы, выклікае трывогу і заклапочанасць усёй інтэлігенцыі краіны. У сувязі з гэтым адзначаем наступнае:

Партыйная прыналежнасць і грамадская дзейнасць з'яўляюцца асабістай, прыватнай справай кожнага грамадзяніна і не падлягаюць кантролю з боку дзяржавы. Права на свабоду сумлення гарантуецца як Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, так і міжнароднымі прававымі нормамі.

Дзяржава не можа патрабаваць ад навукоўцаў звестак пра атрыманыя гранты, бо падобная інфармацыя носіць прыватны характар, хоць справаздачы аб дзейнасці фондаў, у тым ліку і замежных, з'яўляюцца адкрытымі для грамадскасці. Ніводзін закон не абавязвае навукоўцаў, калі яны самі таго не пажадаюць, прадстаўляць падобныя звесткі дзяржаўным установам. Кожны, каму будзе прад'яўлена гэтая "анкета", мае поўнае права адмовіцца адказваць на пастаўленыя пытанні.

Беларускі Хельсінкскі Камітэт разглядае гэты дакумент як яшчэ адзін крок да стварэння паліцэйскай дзяржавы, як імкненне прэзідэнцкіх структур устанавіць татальны кантроль над духоўнай сферай жыцця грамадства. Мы патрабуем неадкладна спыніць грубае ўмяшанне прадстаўнікоў адміністрацыі Прэзідэнта ў сферу адукацыі і гуманітарнай навукі і заклікаем усіх урадоўцаў кіравацца толькі Канстытуцыяй і законамі.

28 лютага 1996г.

УВАГА: ГАВАРЫТ НАРОД!

ТРАСЯНКА – БЕЛАРУСКА-РУСКІ СЛОЎНІК

Не ўсе мовы свету маюць пісьмовы эквівалент, многія існуюць у гутарковай, вуснай форме. Трасянка, пашыраная ў Беларусі ў дваццатым стагоддзі і прагназуемая на актыўнае карыстанне ў першай палове дваццаць першага стагоддзя, -- з ліку непісьмовых моў. Непісьменных слоў, спалучаючых сабой рускі лексічны і беларускі фанетычны варыянты. Напрыклад, трапка (ануча, тряпка).

Тэрмін "трасянка" пайшоў ад назвы корму для буйнай рагатай жывёлы, гэта значыць каровы. Калі ў гаспадара не хапае добрага сена, ён дабаўляе салому, старанна растрасаючы яе. Карова не заўважае падману і з'ядае трасянку. Праўда, малака не прыбаўляе. Так і беларусы: сваёй жудаснай трасянкі не заўважаюць ні ў хаце, ні ў аўтобусе, ні ў Вярхоўным Савеце. На трасянцы гавораць ад Брэста да Магілёва, ад Полацка да Турава, ад селяніна да прэзідэнта, ад невядомага трактарыста да вядомага паэта, ад фальклору да газеты.

Газета "Круг" распачынае збор і друкаванне слоўніка трасянкі. Запрашаем да ўдзелу ў фундаментальнай рабоце ўсіх жадаючых. Давайце бараніць чысціню моваў -- беларускай і рускай. Пакажам беларусам іхнюю моўную жвачку – можа, хоць пасмяюцца над сабой.

Дасылайце ў рэдакцыю пачутыя словы з унікальнай мовы. Пры гэтым майце на ўвазе, што дэфекты дыкцыі, якія бываюць у людзей, і дыялектызмы да трасянкі не адносяцца.

ГАВАРЫТ
гаворыць (бел.), говорит (рус.)

ДЗЯРЭЎНЯ
вёска (бел.), деревня (рус.)

ЖЭНШЧЫНА
жанчына (бел.), женщина (рус.)

ЛАШАТКА
конік (бел.), лошадка (рус.)

ОЧАРАДЗЬ
чарга (бел.), очередь (рус.)

ПАДСОЎНУХ
сланечнік (бел.), подсолнух (рус.)

ПРАВІЦЯЛЬСТВА
урад (бел.), правительство (рус.)

ПРАДЛАГАЦЬ
прапаноўваць (бел.), предлагать (рус.)

ПРАДСЯДАЦЕЛЬ
старшыня (бел.), председатель (рус.)

ПЕРАТРАХІВАЦЬ (кадры)
мяняць (бел.), перетряхивать (рус.)

РАБ'ЁНАК
дзіця (бел.), ребенок (рус.)

РАЖАСТВО
Народзіны Хрыста (бел.), Рождество (рус.)

ТРАПКА
ануча (бел.), тряпка (рус.)

УТРАННІК
ранішнік (бел.), утренник (рус.)

ЎНІМАННЯ
увага (бел.), внимание (рус.)

ЎРЭМ'Я
час (бел.), время (рус.)

ЦВЯТОК
кветка (бел.), цветок (рус.)

ЦЯТРАДЗЬ
сшытак (бел.), тетрадь (рус.)

ШАСТОЙ
шосты (бел.), шестой (рус.)

Збор і падрыхтоўка газеты "Круг"

ЗАБАСТОЎКА МІНСКАГА МЕТРАПАЛІТЭНА

1995 1996

Жнівень 1995г.

МЕТРО І ПРЭЗІДЭНТ

17 жніўня на дзвярах некаторых станцый Мінскага метрапалітэна бялелі шматкі паперы: "Метро не працуе. Забастоўка".

У стане падрыхтоўкі да страйку працоўны калектыў знаходзіўся з сакавіка 1995 года. Прафсаюзны камітэт патрабаваў ад кіраўніцтва мінскага метрапалітэна выконваць калектыўны дагавор: забяспечыць нармальныя ўмовы працы, своечасова выплочваць зарплату. Кіраўніцтва праігнаравала папярэджанне прафкама аб забастоўцы і працягвала парушаць калектыўны дагавор.

Мінскі гарвыканкам і Народны суд Маскоўскага раёна не задаволілі законных патрабаванняў работнікаў метро, не абавязалі адміністрацыю метрапалітэна выконваць свае законныя абавязкі перад падначаленымі.

Палітычных патрабаванняў забастоўшчыкі не выстаўлялі.

Забастоўка ў метро паралізавала гарадскі пасажырскі транспарт. Тысячы людзей спазніліся на працу.

Вечарам па тэлебачанні выступіў прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Ён выказаў абурэнне з нагоды забастоўкі, паабяцаў прыняць да яе ўдзельнікаў жорсткія меры. Прэзідэнт паведаміў, што забастоўку арганізаваў БНФ, а фінансуюць яе "зарубежные воротилы", каб "раскачать лодку" беларускай стабільнасці. Машыністаў электрапаяздоў прэзідэнт абазваў "наглымі рвачамі", якія атрымліваюць у 3-4 разы больш за прэзідэнта і патрабуюць яшчэ больш.

Наступным днём "наглыя" машыністы (15 чалавек) былі звольнены за парушэнне працоўнага заканадаўства (прагул). Усяго было звольнена 58 удзельнікаў забастоўкі.

Кіраўніцтва метрапалітэна і Беларускай чыгункі сумесна прыняло рашэнне пасадзіць на падземныя цягнікі машыністаў наземных электрычак з вузлавых станцый Беларусі. Яны былі мабілізаваны ў Мінск. Прэзідэнт спусціўся ў метро і выступіў перад штрэйкбрэхерамі. Ён падзякаваў іх за разуменне і падтрымку і пажадаў як мага хутчэй навучыцца працаваць пад зямлёй.

Штрэйкбрэхеры вучыліся толькі адзін дзень і адну ноч, ганяючы пад Мінскам пустыя цягнікі.

Забастоўка працягвалася чатыры дні.

21 жніўня 1995 года.

УКАЗ № 336

Гэты ўказ прэзідэнта А. Лукашэнка называўся: "Аб некаторых мерах па забеспячэнню стабільнасці і правапарадку ў Рэспубліцы Беларусь". Прэзідэнцкая рэакцыя на забастоўку:

Пункт 1. Прыпынена дзейнасць Свабоднага прафсаюза і пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі Мінскага метрапалітэна.

Пункт 2. Пракуратуры прадпісана ўнесці ў народныя суды прадстаўленні аб забароне згаданых прафсаюзаў.

Пункт 3. Устаноўлена, што ўдзел палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў у забастоўках на прадпрыемствах транспарту выклікае спыненне дзейнасці гэтых партый і аб'яднанняў.

Пункт 4. Прыпынены законы Рэспублікі Беларусь, згодна з якімі ўстаноўлена недатыкальнасць дэпутатаў РБ.

21 жніўня 1995 года.

АРЫШТ ДЭПУТАТА

У 16 гадзін 30 хвілін дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Сяргея Антончыка без яго згоды ўзброеныя міліцыянеры пасадзілі ў машыну і адвезлі на тэрыторыю вайсковай часці 5529 МУС Беларусі (Мінск, Другі Прылукскі завулак, 3).

Дэпутата захапілі ў памяшканні Свабоднага прафсаюза, дзе ён знаходзіўся па службовых справах.

Ноч дэпутат правёў на вартай.

Раніцай 22 жніўня 1995 года дэпутата С. Антончыка перавезлі ў караульнае памяшканне роты аховы Калоніі строгага рэжыму (вул. Апанская). Запрасіць адваката і пракурора адмовілі.

У 18 гадзін дэпутата С. Антончыка перавезлі ў цэнтр падрыхтоўкі ўнутраных войск (Ракаўская шаша). Там пад наглядам узброеных міліцыянераў ён правёў другую ноч арышту.

У 9 гадзін 23 жніўня дэпутата С. Антончыка прывезлі ў будынак КДБ рэспублікі, дзе адбылася размова са следчым. Пасля чаго арыштанага вызвалілі.

Усе тры дні родныя і калегі Сяргея Антончыка не ведалі аб яго месцазнаходжанні, шукалі яго ва ўстановах міліцыі і КДБ, але безвынікова. Чалавек - як прапаў.

Арыштаваных удзельнікаў забастоўкі (21 чалавек) трымалі ў спартыўнай зале вайсковай часці 5529. Да кожнага быў прыстаўлены баец пры поўнай выкладцы. Пасля допыту следчага ўсіх (паасобку) адпусцілі.

23 жніўня 1995 года.

ЗАБАСТОЎКА І СУД

Мінскі гарадскі суд звышаператыўна закончыў разгляд справы па факту забастоўкі ў метро і прызнаў яе незаконнай.

Пасля заканчэння суда лідэры аб'яднанага прафсаюзнага камітэта метрапалітэна Уладзімір Макарчук і Мікалай Канах былі ўзяты пад варту і дастаўлены ў вайсковую часць МУС.

Жнівень-верасень 1995 года.

МЕТРО І МІЛІЦЫЯ

Метро працуе. Але інтэрвалы руху электрычак павялічаны: новыя машыністы яшчэ вучацца.

Побач з кожным штрэйкбрэхерам, а таксама ў кожным вагоне сядзяць міліцыянеры. Дзяржаўная прэса паведаміла, што ў метро магчымы дыверсіі тых, хто працягвае "раскачивать лодку".

Замежныя прадстаўніцтвы рэкамендавалі сваім супрацоўнікам устрымацца ад карыстання мінскім метро. Баяцца аварыі, бо машыністы - недавучаныя.

28 жніўня 1995 года.

ШТРЭЙКБРЭХЕРЫ І ЎЛАДА

"Выканаўчы камітэт Мінска ад імя ўдзячных жыхароў сталіцы выказвае шчырую ўдзячнасць за дапамогу ў нармалізацыі работы метрапалітэна. Ваша прынцыповая грамадзянская пазіцыя і высокі прафесіяналізм дазволілі ў кароткі тэрмін аднавіць рух электрацягнікоў метро".

Падзячныя лісты падобнага зместу ўручаны 60 беларускім і 11 маскоўскім машыністам, якія замянілі бастуючых метрапалітэнаўцаў. Разам з падзячным лістом кожны атрымаў таксама імянныя гадзіннікі і пасведчанні на права кіравання лакаматывам у метро.

Мэр горада Уладзімір Ярмошын, выступаючы перад сабраўшыміся, запэўніў, што ніякіх рэпрэсій у адносінах да забастоўшчыкаў прынята не будзе. Ён паабяцаў сваё садзейнічанне ў працаўладкаванні тых, хто звольнены.

(З афіцыйнага друку.)

Верасень, кастрычнік, лістапад 1995 года.

МІНСК І СВЕТ

Міжнародная прафсаюзная супольнасць выказала сваю салідарнасць мінскім метрапалітэнаўцам-забастоўшчыкам і сваё абурэнне з нагоды незаконных дзеянняў улады.

У Мінск паступаюць сабраныя ў свеце сродкі, каб падтрымаць непрацоўных работнікаў метро.

23 кастрычніка 1995 года.

Вярхоўны суд і ісціна.

Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь вынес сваё рашэнне: забастоўка метрапалітэнаўцаў была незаконнай.

8 лістапада 1995 года.

ЗАБАСТОЎКА І КАНСТЫТУЦЫЯ

Канстытуцыйны суд Рэспублікі Беларусь пад старшынствам намесніка старшыні КС Валерыя Фадзеева праверыў на адпаведнасць Канстытуцыі РБ указ прэзідэнта ад 21 жніўня 1995 года № 336 -- і прыняў рашэнне:

Прызнаць не адпавядаючымі Канстытуцыі, законам Рэспублікі Беларусь і міжнародна-прававым актам пункты 1, 2, 3, 4 указа прэзідэнта А. Лукашэнка "Аб некаторых мерах па забеспячэнню стабільнасці і правапарадку ў Рэспубліцы Беларусь".

Лічыць пункты 1, 2, 3, 4 указа не маючымі юрыдычнай сілы з моманту яго апублікавання.

Прапанаваць прэзідэнту і іншым дзяржаўным органам, якія ўжо выканалі ўказ, прывесці нарматыўныя акты ў згоду з заключэннем Канстытуцыйнага суда, якое з'яўляецца канчатковым і абскарджанню не падлягае.

16 лістапада 1995 года.

КАПРЫЗНАЯ ФЕМІДА

У народным судзе Маскоўскага раёна Мінска скончыўся працэс па ісках 30 звольненых работнікаў метро, якія прымалі ўдзел у забастоўцы. Іскі выстаўляліся супраць адміністрацыі электрадэпо "Маскоўскае". Вяла працэс суддзя Іна Цэсік.

Па рашэнню суда на былым месцы працы адноўлены тры работнікі метро. Дваццаці пяці работнікам у іску адмоўлена па прычыне... недаказанасці.

Дзве справы спынены: адзін ісцец ад іску адмовіўся, другі быў адноўлены на працы адміністрацыяй дэпо.

Працэс працягваўся амаль два месяцы.

Люты 1996 года.

МЕТРО І ЧАРНОБЫЛЬ

З 58 звольненых работнікаў метрапалітэна 46 чалавек не адноўлены на працы.

Беспрацоўным метрапалітэнаўцам адмаўляюць у працы і на іншых прадпрыемствах Мінска, калі даведваюцца аб іх удзеле ў забастоўцы.

Канстытуцыйны суд направіў прэзідэнту і Вярхоўнаму Савету Пасланне "Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 1995 годзе". Стан законнасці прызнаны нездавальняючым. Каменціруючы на прэс-канферэнцыі Пасланне, старшыня КС Валерый Ціхіня канстатаваў прыход у Беларусь прававога Чарнобыля.

---

19 жніўня 2045 года.

ПАДЗЕМНЫ ВЫТОК ВЫЗВАЛЕННЯ

З газеты "Круг", № 2.125, стар.77:

"15 жніўня Еўрапейскі прамень Беларускага метрапалітэна вытрымаў значную перагрузку. Тысячы і тысячы жыхароў Мінскага мегаполіса ехалі да станцыі Койданава, у многіх у руках былі дзяржаўныя бел-чырвона-белыя сцяжкі. Трэба адзначыць, што рух быў добра арганізаваны, што пацвердзіла выдатныя традыцыі нашага метро. Па ніжнім тунелі адпраўлялі пасажыраў цэнтра, магнітныя модулі не спыняліся на прыпынках, шлях у 30 кіламетраў займаў 10 мінут. Па верхнім тунелі магнітамодулі рабілі прыпынкі на станцыях і забіралі пасажыраў Перыферыі.

Станцыя Койданава размяшчаецца на тым напрамку Беларускага метрапалітэна, на якім 50 гадоў назад стаяла электрадэпо "Маскоўскае" (зараз на тым месцы шуміць парк імя Пятнаццаці Машыністаў). У горадзе-спадарожніку (пэўны час ён называўся Дзяржынск) па рашэнню Вярхоўнай Рады Рэспублікі Беларусь у сціслыя тэрміны пабудаваны мемарыял у гонар першага паўстання беларускага народа, якое, як вядома, пачалося 17 жніўня 1995 года на Мінскім метрапалітэне і, нягледзячы на жорсткае падаўленне дыктатурай, урэшце рэшт прывяло да Беларускага вызвалення.

Мемарыял сціплы і лаканічны. Дзве рэйкі выходзяць з-пад зямлі, сімвалізуючы, што выток беларускага вызвалення – тагачасная Мінская падземка, дзе паязды рухаліся па жалезных рэйках. Недзе знайшлі тагачасны вагон метро, паставілі яго на рэйкі. У пярэдняй частцы вагона размясцілі фігуры машыніста, побач з ім – фігуру міліцыянера, які занёс над галавой машыніста дубінку.

Васьмідзесяцігадовы ветэран беларускага метрапалітэна, які выступіў на адкрыцці мемарыяла, прасляззіўся, убачыўшы жудасную карціну канца дваццатага стагоддзя. Ён расказаў, што менавіта так і было: дубінка дыктавала, куды ехаць людзям.

Нашы людзі не скарыліся і самі выбралі сабе шлях. Аўтары мемарыяла ўвасобілі яго ў экспрэсіўны вобраз. Адразу за старэнькім вагонам чорныя рэйкі ўздымаюцца над зямлёй, ператвараюцца ў птушку з белымі крыламі і чырвоным сэрцам. Вольную птушку – Беларусь.

Пасля мітынгу вядомыя артысты выканалі лазера-спектакль, створаны паводле вядомай у канцы мінулага стагоддзя народнай пенталагічнай паэмы, у цэнтры якой вобраз тыповага тутэйшага з дзіўнаватым імем Лука Мудзішчаў. Як заўсёды бывае ў народнай творчасці, канкрэтная аснова твора згубілася ў дзесяцігоддзях. Зараз мала хто і ведае, як сучаснікі расшыфроўвалі таго Луку Мудзішчава. Затое тыповыя рысы так званых тутэйшых, што насялялі Беларусь у дзевятнаццатым-дваццатым стагоддзях, захоўваюцца як прытчы ў анекдотах, паданнях, мастацкіх творах, гістарычных хроніках.

Хроніку сабраў і праз паўстагоддзя на яе зірнуў -- Алесь ПАПЛЕЧКА

26.04.1986: ВЗОРВАЛАСЬ ЦИВИЛИЗАЦИЯ

Анатолий ДЕЛЕНДИК

УЖАС ПРАВДЫ

Знакомому врачу, который лечит пострадавших от аварии на Чернобыльской АЭС, я сказал, что хочу написать очерк о его пациентах. Напомнил, что были у меня о Чернобыле художественный фильм "Волки в зоне" и драма "Диагноз".

Он саркастически усмехнулся:

--Будешь опять нагнетать ужасы?

--Правда о Чернобыле для тебя ужасна в каком смысле?

Он горестно пояснил:

--Сколько публики на этой аварии погрело руки! Сколько спекуляций под флагом Чернобыля! Раньше руководители ссылались на войну. Долгие годы! Не можем создать людям достойную жизнь – потому, что была война! Как будто Германию или Японию война разрушила меньше... А потом – авария! Слава тебе, Господи! Теперь все наши беды – конечно же, только от Чернобыля! И беды, и благополучие. Многие на Чернобыле сделали карьеру, катались по заграницам, создали фонды-кормушки, написали монографии, защитили диссертации, получили высокие звания, теплые должности!.. Сколько разбазарено средств!

--Давай откровенно поговорим об этом. Я могу назвать твою фамилию? -- сказал я, доставая диктофон.

--Хочешь, чтобы меня не только сняли, но и съели?

--Но ты можешь ответить на мои вопросы?

--Разумеется. Но – инкогнито.

--Сейчас переселенцам разрешили возвращаться в родные места. Ты мог бы жить в чернобыльской зоне?

--В тридцатикилометровой, за колючей проволокой, где выпал стронций, -- нет. Там лучше построить, проведя основательную дезактивацию, новую АЭС. Все равно мы к этому придем. Ожегшись на молоке, поохаем, повздыхаем и начнем строить – надежную, безаварийную, как, например, у французов. Альтернативы атомной энергетике в наших условиях нет. А там, где зараженность почвы до 15 микрокюри, на мой взгляд, жить можно.

-- А питаться – лучше привезенными продуктами?

--Нет, есть можно все, с огорода и с поля. А то, что растет в лесу и на болотах, -- нельзя. Запретить категорически. Там больше всего держится радиация.

-- Как объяснить это корове, которой захочется погулять в лесу?

--Говорят, -- усмехнулся он, -- что если зайца хорошо бить, то можно научить его зажигать спички.

--А детям, которые на опушке леса нашли спелые ягоды? Старикам? Как втолковать крестьянину, что это – не луг после дождя, а зараженное болото? И есть ли между ними разница? И не принесет ли ветер что-то нежеланное из рощи? Не возводить же китайскую или берлинскую стену!

--Вместо ответа расскажу тебе об одном забавном случае. После аварии я полгода работал в зоне, за проволокой. Приходилось сопровождать и зарубежные делегации. Однажды японские медики, увидев в бесхозном саду крупные красные яблоки, дружно бросились к деревьям и стали набивать сумки и портфели! Тут же, потерев яблоко платочком, стали есть!

--Нечто похожее мы наблюдали в студенческие годы, когда вместе учились в медицинском. Помнишь, как мы были шокированы, когда в анатомичке студентки, рядом с трупами, ели бутерброды?

--Тут – другое. В тридцатикилометровой зоне! Радиация – за сто единиц! Но они были специалистами и знали, что внутри яблок радионуклидов нет – яблоня соки берет глубоко из земли. Если они и попадут в соки, то останутся где-то в стволе. В тридцатикилометровой зоне можно сеять технические культуры, выращивать зерно на спирт.

--Значит, самогонка будет под названием "Зона"... А семью свою ты там поселил бы?

--У меня здесь работа, трудная, но интересная, квартира, друзья, знакомые... Да и радиации тогда схватил немало, хожу с бомбой в костях... А вот если переселенцам на чужбине жить плохо, если в городе они чувствуют себя, как заяц, помещенный в клетку, а по ночам видят во сне цветущие берега Припяти, -- то как их сдержать?.. Но везти туда детей не советовал бы.

--Значит, не все так благополучно, как ты нарисовал, коллега?

--Единственные достоверные последствия чернобыльской аварии, не считая лучевой болезни, -- это рост рака щитовидной железы. Но это последствия поражения в первые дни после аварии, когда все европейские страны профилактически принимали йод, а наши руководители громогласно вещали: ничего страшного не случилось, не надо травить себя йодом!

--Но возвращаться туда, как предлагают наши власти, основываясь на какой-то новой концепции... Эксперимент века? Люди – кролики?

--Наша ситуация уникальная, коллега и писатель. Такого не было ни у японцев, ни у других. Нужно время, чтобы увидеть последствия. А пока каждый, кто сломает палец или вывихнет челюсть, обвиняет Чернобыль... Удобно! Выгодно!

--Будто никто не умирал от радиации...

--Да, умирали и умирают. Чернобыль – это серьезно. Но не надо преувеличивать. Вокруг радиации поднято столько шума!

--Странно это слышать от тебя: лечишь чернобыльцев – и не знаешь, от чего.

--Знаю, что, помимо больных, уйма примазавшихся! Недавно школьница пятнадцати лет пробыла у нас две недели. Когда мы решили ее выписать, поскольку показаний для пребывания не было (а очередь к нам – огромная!), она возмущенно заявила: "А я свой срок еще не отбыла! И в этом году я еще нигде не отдыхала!" Скажи, в каком еще государстве так развращен народ? Рвутся к нам не те, кто действительно больны, а кто имеет возможность попасть. В одной из палат лежит прокурор, всю жизнь боровшийся с преступниками. Участник финской войны, Отечественной, несколько раз был ранен. Он получает пенсию, бездарно усредненную нашими мудрыми законодателями, -- шестьсот пятьдесят тысяч. А рядом на койке – тридцатишестилетний бугай, пьянчуга, месяц поработавший ликвидатором. Его пенсия – свыше двух миллионов! Справедливо? Зачем ему работать? Прав Павел Бунич: "В этой стране кто не работает, тот ест того, кто работает." Известно, что многие начальники постарались получить чернобыльские льготы. Даже бывший хозяин республики, главный виновник многих наших бед, запрещавший информацию об аварии, получил удостоверение, пробыв полдня в Хойниках или Брагине. Причем, ходил в спецботинках со свинцовой подошвой, с привезенной водой из Минска... А есть строитель, получивший на ликвидации аварии лучевую болезнь. Несколько раз оперирован, с обезображенным лицом... Его заболевание бюрократы не связывают с ликвидацией аварии – экономят...

--От экономии, как ты знаешь, родилась и новая концепция, разрешающая людям жить на зараженной территории. Увы, государство не имеет средств, но признать этого не желает. Врет о безопасности.

--Я скажу тебе, где взять средства. В Швеции – два освобожденных водителя легковых машин, для руководителей страны. А сколько у нас? Только в Минске! В двух, бывших гаражах ЦК и Совмина, не менее пятисот человек! А в других гаражах? А по всей республике? В цивилизованных странах каждый начальник сам садится за руль. Но только ли с водителями барствуем? Посмотри, какая огромная у нас армия! В Японии, на сто тридцать миллионов населения, -- сто тысяч человек. А у нас – на десять миллионов столько же военных. Вот куда улетают денежки, так нужные отселенцам и возвращенцам! Древние римляне говорили: наиболее богато то государство, которое меньше других тратит на свои институты управления. А сколько чиновников у нас? Полчища, тьма! Тогда, в 1986-ом, я многое увидел. И благородство, когда молоденькие солдатики, без спецодежды, даже без рукавиц, не думая о себе, старались предотвратить распространение радиации... Где они сейчас? А что было спустя год, два? Каждая покинутая квартира была многократно ограблена. Все вывозилось и продавалось. Чаще всего теми, кто охранял, или с их небескорыстного ведома. Даже дома деревянные разбирались и вывозились на "Колхидах" на продажу. А тот, кто покупал, -- не знал, откуда привозили разобранный дом. В Припяти, после эвакуации, между соперничающими бандами шли ожесточенные бои за награбленное. За телевизоры, холодильники, стиральные машины. Стреляли из автоматов и пулеметов.

Я решил вернуть бывшего коллегу к медицине и спросил:

--Многие свидетельствуют, что у людей снижен иммунитет. Если раньше простуда проходила быстро, то теперь тянется неделями.

--Сомневаюсь, что в этом виновата радиация. Хорошо бы взять две группы населения, чернобыльскую и контрольную, сравнить по длительности простудных заболеваний. Я думаю, больше людей напуганных, переживших стрессы, чем подвергшихся опасным дозам радиации.

--Говорят, мы вырождаемся? Превращаемся в мутантов?

--Разговоры о вырождении, мягко говоря, преувеличены. Здоровье главным образом зависит от генетики, затем от условий жизни – жилище, питание, работа, климат – и в меньшей степени от экологии. Конечно, загрязнение – не подарок. Но столько ваш брат журналист постарался нагнать страху! Почитали бы монографию академика А.Л. Ильина "Мифы Чернобыля". Объективный взгляд на проблему.

--Это негуманный взгляд! Это взгляд атомщика, а не защитника здоровья людей.

--Не думаю. Эксперты МАГАТЭ тоже придерживаются таких взглядов. Не все зараженные территории должны пустовать. Надо там возрождать хозяйственную деятельность, селить людей.

--Будто ты не знаешь, что международное атомное ведомство – сторона заинтересованная! Для МАГАТЭ важнее всего доказать безальтернативность атомной энергетики, они забыли о человеке. Нельзя возвращать человека на загрязненные территории. Полной гарантии не может дать никто. Ведь достаточно одной горячей частицы, попавшей в легкие, чтобы начался злокачественный процесс. Как можно ратовать за возвращение туда, где этих частиц мириады? Не существует безопасных доз радиации. Любая доза убивает клетки. При здоровом иммунитете организм с ними справляется. Но кругом – химизация, мелиорация, соли тяжелых металлов. При нашем невежестве, казенном отношении к людям, неумении и нежелании наладить их быт, наплевательском отношении к их здоровью – нужно сразу строить там и крематории! Летом девяносто второго года, под Минском, выступил японский ученый Тагаки. Ссылаясь на горький опыт Хиросимы и Нагасаки, он сообщил, что рост онкологических заболеваний проявился через 10-15 лет. Количество умерших от рака составило более 200 000 человек. Твои комментарии?

--Я скажу тебе вот что. С Чернобылем Беларусь повенчана навсегда. Так получилось, такова наша судьба. И никто нам не поможет. Поэтому лучше не причитать, не рвать на себе волосы, а искать оптимальный вариант, как приспособиться к этой беде с минимальными потерями. Как приспосабливаются терпеливые жены жить с мужьями-пьяницами. Людей убивает не радиация, а нищета, плохое питание, отсутствие соков, фруктов, витаминов, безработица, бесперспективность, неуверенность в завтрашнем дне, депрессия, стрессы, отчаянье... Вот где Чернобыль!

Мнение "К"

УЖАС ЛЖИ

Писатель Анатолий Делендик (в прошлом врач) представил нам типичного деятеля "по чернобыльской тематике" (так они выражаются), который одновременно признает трагедию Чернобыля и... отрицает. Отныне и далее, и во веки веков, главную опасность для человечества несет собственно не Чернобыль, а именно такие деятели, потворствующие самой отвратительной и губительной черте человека – привыканию.

Животные не могут привыкнуть к изменениям среды обитания – и погибают. Человек – может. Свинья в грязном хлеву до последнего сражается за чистый уголок-спальню, а человек быстро сдается и забывается в любом дерьме. Хотите образец? Молодая мать (не пьяница!) с тремя детьми в "чернобыльской" деревне, где 25 микрокюри.

Вполне возможно, что в ту деревню ее погнало отсутствие жилья. Но если бы ей сказали правдиво, недвусмысленно: "Поедешь туда – твои дети станут калеками" – она бы не поехала никогда. Так не сказали. Доктор, предпочевший остаться инкогнито, предупредил ее об опасности, но добавил, что, может, и пронесет. Ученый разработал для нее "новую" концепцию выживания. Министр пообещал три банки тушенки (на ребенка – по одной). Президент подарил трехканальный радиоприемник.

Трагедия в том, что все "чернобыльские деятели" объединились в узкоспециализированную мафию-касту и сообщают остальному человечеству 50 процентов правды, 50 процентов лжи. Получается, Чернобыль как бы есть и как бы отсутствует. Дородный господин-начальник "чернобыльского министерства" как бы рисуется на трибуне и как бы невидимка, ибо наяву не дела и свершенья подчиненного ему ведомства, а непостроенные дома для переселенцев, крадежь, приписки, вранье, "уточненная концепция защитных мер", урезание "чернобыльских льгот", обмен удостоверений "ликвидаторов" и как конечный итог – молодая мать на фоне 25 микрокюри с тремя "детьми Чернобыля", у которых к обеду из носа идет кровь, голоса осипшие, как у старичков, а в глазах недетская тоска.

50 процентов правды – не в счет, если в детских глазах тоска. Мы выживем при условии 100-процентной "чернобыльской правды".

Правда вышвырнет на задворки лжеученых, выполняющих заказ властей, не умеющих организовать защиту народа от последствий Чернобыля. Правда перетряхнет двуличное правительство. Правда разоблачит спесивых "спецов" а ля радиация, "знающих" путь развития цивилизации и пренебрегающих всеми, кто "не знает", кто "гуманист" и "дилетант".

Аргументы противников – за и против смертной казни – за века устоялись, отшлифовались, стали интернациональными. Специалисты Белоруссии, понятное дело, тоже имеют свои суждения. Их корреспондент "К" слышал из уст высокопоставленных юристов, но сослаться на эти уста, увы, не может. Ибо собеседники прикладывали к своим устам палец и говорили: "Ш-ш-ш, не для печати!"

ТОРЖЕСТВО СПРАВЕДЛИВОСТИ

СМЕРТНАЯ КАЗНЬ

ПЕРЕЖИТОК ВАРВАРСТВА

ПОМИЛОВАНИЕ ПРЕЗИДЕНТА

Процедуру помилования проходит каждое "расстрельное дело". Даже если преступник не просит заменить смертную казнь на более легкое наказание (как правило, это 15 лет тюрьмы), его не расстреляют без участия президента страны.

Отдел помилований в 1994 году, после президентских выборов, переместился из администрации Президиума Верховного Совета в администрацию президента Александра Лукашенко и называется нынче так: отдел по вопросам прав человека, гражданства и помилования. Технология помилования следующая.

Сотрудники названного отдела изучают материалы, приобщенные к делу (характер преступления, решения судов всех инстанций, кассационные жалобы, прошение преступника) и "выносят вопрос" на заседание Комиссии по помилованиям.

В Комиссию входят 15 человек: высокопоставленные служители органов правосудия, государственные мужи, общественные деятели юриспруденции республики. Перед ними стоят два вопроса: 1. Казнить? 2. Помиловать?

Решение о судьбе заключенного принимается путем открытого голосования. Схема проста: кто за то, чтобы казнить, -- поднять руки...

Голосование – поименное, фиксируется в соответствующем документе. Так что к судьбе человека, ждущего в тюрьме своей участи, лично прилагает свою руку каждый из 15.

Сложившаяся за последние два года практика такова: подавляющее большинство членов Комиссии по помилованиям голосует за то, чтобы приговор оставить без изменений. То есть – расстрелять.

Сложных ситуаций, когда мнения членов Комиссии, как говорят, разделились поровну, не было. Иными словами, мнение единодушно: расстрелять.

Решение Комиссии поступает на стол президенту. В тиши его кабинета и завершается судьба человека, приговоренного за злостные преступления к высшей мере наказания. Окончательное решение президент принимает единолично. Сложившаяся практика такова:

В 1994 году президент Лукашенко не помиловал ни одного преступника, приговоренного к расстрелу.

В 1995 – аналогично.

СУДОРОГА ОБЩЕСТВА

Белоруссия накануне вступления в Совет Европы. Главное требование СЕ – отмена смертной казни. Но об этом требовании в Белоруссии – странный молчок. Молчат верхи, молчат низы. Трусливо шепчутся юристы.

Проблему смертной казни необходимо рассматривать на фоне всей политико-правовой системы государства. Белоруссию в этом отношении ярко и точно охарактеризуют следующие цифры.

В исправительно-трудовых учреждениях и следственных изоляторах страны сейчас находится свыше 53 тысяч человек.

На 100 000 жителей Белоруссии приходится 407 заключенных, в Латвии – 267, в Молдавии – 272, в Украине – 292.

Феномен Белоруссии в том, что количество заключенных здесь намного превышает усредненный показатель соседних стран со схожими социально-экономическими условиями.

Белоруссия все в большей степени приближается к тоталитарной модели не только устройством своей государственно-политической машины (силовые методы управления, фактическая цензура, игнорирование Конституции исполнительной властью), но и в ориентации обслуживающего правосудия на ужесточение наказания.

Политика и право в Белоруссии все теснее переплетаются, срастаются в античеловеческий гибрид, название которому – карательная политика.

Карательная судорога исказила лицо государства и лицо общества, избравшего себе именно такое государство. Международная амнистия в 1977 году получила Нобелевскую премию за деятельность по защите прав человека, по отмене смертной казни, а в Белоруссии эту организацию походя шельмуют. Белорусские госмужики любят яркие галстуки, выступления по телевизору, народ, Европу, а также Совет Европы, куда им хочется вступить, чтобы чаще туда ездить. Закрыть расстрельную судорогу новым галстуком – и поехать.

Страницу подготовил Антон БАСУЧОК

В цивилизованной Америке смертная казнь отменена не во всех штатах. А там, где была отменена, происходило страшное: родственники жертв своими руками расправлялись с убийцами. Общество чрезвычайно ожесточилось, разделилось.

Разгул организованной преступности, заказные убийства, жестокие пытки перед убийствами, игра в карты на жизнь человека – вот характерные черты нашего времени. И если сейчас отменить смертную казнь – будет новая лавина убийств. Ничто не сдержит организованную банду от намеченного зверства. Убийцы будут знать: к "вышке" не приговорят, а из тюрьмы убегу, друзья вызволят, за большие деньги кого хочешь купишь, а бедного "начальника" тем более.

В существующей в стране обстановке смертную казнь отменять нельзя. Сегодня не время для отмены смертной казни.

Да, говорят, что жестокость порождает жестокость, но пока смертная казнь должна сохраниться. Кара за преступление должна быть соразмерная с ним. После оглашения справедливого приговора, когда жестокого убийцу приговаривают к высшей мере, в зале суда нередки аплодисменты. Люди отзываются на справедливость.

Убийца считает, что он имеет право убить человека. Почему же мы, общество, не имеем права наказать убийцу за тягчайшее преступление? Человек имеет право на месть, потому что он человек, живое существо. Почему же общество надо лишать права отмщения? В Библии на сей счет говорено прямо: зуб за зуб, око за око, жизнь за жизнь. Это выработано человечеством.

Не убивай – и тебя не убьют. Вот простое правило жизни. Следуй ему – и будешь в ладах и с законом, и с моралью.

Государственная месть – законна, она защищает общество, всех нас.

СПРАВЕДЛИВЫЙ ПРИГОВОР

Чтобы уйти от ответственности или смягчить наказание, осужденные и их родственники все чаще ищут защиту в Организации Объединенных Наций, "Международной Амнистии" и т.д. Но непонятно, почему эти организации выступают в роли защитников преступников. Многим известно так называемое "Светлогорское дело". Житель Светлогорска Миренков на протяжении нескольких лет обманным путем увозил в лес несовершеннолетних мальчиков, глумился над ними, шестерых при этом убил, трупы закопал в лесу. За содеянное Миренкова приговорили к смертной казни. Сотни людей приговор восприняли как справедливый. В то же время ассистент Датского отделения "Международной амнистии" Метте Нильсон обратилась с просьбой о замене Миренкову смертной казни. Она пишет, что негуманно лишать жизни человека. Так и хочется спросить, а как бы вели себя все эти "защитники", если бы убивали их детей?

Можно еще сколько угодно проводить подобные примеры, но суть, мне кажется, ясна: пока общество будет смиренно взирать на своих "заблудших овец" и даже покрывать их, никакая милиция преступность не победит...

О. ЛИТОШКО,
старший советник юстиции
Гомель

(Газета "Советская Белоруссия", 23 февраля 1996)

СВОБОДА СЛОВА, НО НЕ ЧУШЬ СОБАЧЬЯ

ПУБЛИКУЯ СУДЕБНЫЙ СЮЖЕТ В ДОКУМЕНТАХ, РЕДАКЦИЯ ПРОСИТ АВТОРОВ-СОЗДАТЕЛЕЙ ОНЫХ ИЗВИНИТЬ ЗА НЕКОТОРЫЕ СОКРАЩЕНИЯ, ПРОДИКТОВАННЫЕ ГАЗЕТНОЙ СТРАНИЦЕЙ. ЧТОБЫ НЕ ИСКАЗИТЬ СМЫСЛ МАТЕРИАЛА, РЕДАКЦИЯ СТРЕМИЛАСЬ МАКСИМАЛЬНО СОХРАНИТЬ И СУТЬ, И КОНТЕКСТ.

1. ЗДРАДА

З перапісу вынікае, што на 100 тысяч грамадзян кожнай нацыянальнасці дактароў навук сярод беларусаў -- усяго 6 чалавек, расейцаў жа – 33 чалавекі, іншых нацыянальнасцей – 34 чалавекі.

Тое ж з колькасцю кандыдатаў навук.

Беларусаў і тут усяго – 93 чалавекі, расейцаў жа – 398 чалавек, іншых нацыянальнасцей – 296 чалавек.

Дадам, што сярод мастакоў беларусы складаюць усяго – 52%, у Саюзе кампазітараў -- 42%, у Саюзе кінадзеячоў -- толькі 31%, выкладчыкаў ВНУ -- 56%...

Расейскія камуністы, прыпёршыся на Беларусь, узялі за моду мачыцца і сяліцца са скацінай у нашых цэрквах, касцёлах, палацах...

Роль белых насіллем, абманам і тэрорам захапілі расейцы, роль каляровых яны аддалі прадстаўнікам іншых нацыянальнасцей...

І як паказвае апошняе стагоддзе, у нас не было і няма больш бессаромных ворагаў, як расейцы. І на вялікі жаль, і дэмакратычная Расея вядзе ў адносінах да нас тую ж палітыку, як і царская Расея і Расея камуністаў.

І карысна ўспомніць гісторыю беларусаў гэтага стагоддзя. Зноў нас расейцы дзялілі з рознымі немцамі, палякамі і г.д. У гэтых дзяляжах яны забівалі беларусаў, прымушаючы нас ваяваць на сваім баку. У вайне 1939-1945 гадоў загінуў кожны чацвёрты, нас гналі прама на кулі, не шкадуючы. Нішчылі ў мірны час.

Закончыўшы "пераможную вайну", мы згубілі Беластоцкую вобласць, заселеную беларусамі. Нідзе ў свеце няма такога прыкладу. Пасля вайны расейцы абвясцілі нас "неполноценными", таму што мы былі ў акупацыі. А самі драпалі ад немцаў, толькі абмоткі целепаліся.

Аб'явіўшы беларусаў "неполноценными", пачалі высяляць нас з нашай замлі пад рознымі зачэпкамі ў неабжытыя месцы імперыі, а сюды прыпіраліся расейцы, каб паесці хоць добра бульбы з салам і атрымаць пасады. Нас не выпускалі з ярма. Тут яны абапіраліся на гультаёў, злодзеяў, даносчыкаў і курапацкіх гіцаляў, якім дазволена было ўступаць у кампартыю і наглядаць за намі. З іх дапамогай нішчылася наша культура, мова, звычаі, мараль...

Тым расейцам, каму папярок горла наша незалежнасць, Нейтралітэт, мова, лепш выехаць з Беларусі. Расея вялікая, а мы торбу збяром на дарогу.

Павінны быць уведзены квоты на назначэнне на пасады беларусаў у прапорцыі, як гэта беларусы складаюць да ліку насельніцтва на Беларусі.

А. БЛІНКОЎСКІ, БСДГ (Грамада)

2. ЗАКЛЮЧЕНИЕ ЭКСПЕРТА

На основании постановления ст. следователя прокуратуры г. Барановичи Кухарчука П.В. от 10.11.94 старшим научным сотрудником Института философии и права Академии наук Беларуси, кандидатом юридических наук Потеружа И.И. изучены статьи журналиста А. Блинковского "Здрада" и "З пошты газеты", опубликованные в газете "Баранавіцкае слова", на предмет выяснения, допустил ли А. Блинковский в указанных статьях высказывания, оскорбляющие национальное достоинство русского населения Беларуси, направленные на разжигание национальной вражды или розни, а также содержатся ли в них призывы к войне или насильственному свержению или изменению государственного или общественного строя Республики Беларусь.

В статьях А. Блинковского "Здрада" и "З пошты газеты" содержатся резкие, явно несоответствующие действительности или просто надуманные автором антирусские высказывания, направленные на унижение достоинства лиц русской национальности и возбуждение ненависти к русскому народу, противопоставление русских белорусам. Данные публикации могут рассматриваться, как направленные на возбуждение национальной вражды или розни.

Приведенные выше утверждения автора статей о россиянах, их действиях и стремлениях содержат высказывания, оскорбляющие честь и достоинство русской национальности.

В статье А. Блинковского "Здрада" содержатся призывы к ограничению прав граждан Республики Беларусь в зависимости от их национальной принадлежности, что также направлено на возбуждение межнациональной вражды и розни.

В данных публикациях А. Блинковского прямых призывов к войне или к насильственному свержению или изменению государственного или общественного строя Республики Беларусь не содержится.

3. ЗАКЛЮЧЕНИЕ КОМИССИИ

Мы, нижеподписавшиеся, доцент кафедры этики БГУ, кандидат философских наук Зеленкова Инесса Львовна (стаж работы по специальности 20 лет), кандидат юридических наук, доцент кафедры уголовного права, заместитель декана юридического факультета БГУ по науке Хомич Владимир Михайлович (стаж работы по специальности 22 года) и профессор кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени БГУ, доктор исторических наук Зелинский Петр Иосифович (стаж работы по специальности 30 лет), в г. Минске, на основании постановлений старшего следователя прокуратуры г. Барановичи юриста 2 класса Козел Э.Г. от 19.12.94 года и 28.12.94 года провели комиссионную историко-этическую экспертизу по материалам уголовного дела № 581.

По своей форме и содержанию некоторые высказывания данных статей объективно могут рассматриваться как разжигающие национальную вражду и рознь...

Выражений оскорбительного характера в строгом значении смысла термина "оскорбление" в данных публикациях нет, хотя с этической точки зрения статьи крайне некорректны, что ведет к неправильной постановке вопроса о соотношении общечеловеческого и национального в морали, извращению сути нравственности. По существу и форме эти неэтические выражения могут рассматриваться в качестве повода для разжигания национализма и аморальных проявлений разнообразного толка.

Призывов к ограничению прав граждан Беларуси в зависимости от национальной принадлежности или отношения к религии в данных публикациях не содержится.

Призывов к войне или насильственному свержению или изменению государственного или общественного строя Республики Беларусь в данных публикациях также не содержится.

Исходя из контекста статей Блинковского А.А., под термином "расейцы" следует понимать представителей всех национальностей РФ, но, главным образом, как некорректную форму обозначения имперских амбиций прошлых и настоящих российских политиков.

28 февраля 1995г.

4. ПРИГОВОР СУДА

ИМЕНЕМ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Судебная коллегия по уголовным делам Брестского областного суда в составе: председательствующего Устимчук Н.С., народных заседателей Волошкина В.Н., Шабановой Н.М., при секретаре Борисовой О.И., с участием прокурора Рачковского Р.К., адвоката Позднякова А., общественного защитника Берната М.Я.

21 сентября 1995г. в открытом судебном заседании в гор. Барановичи рассмотрела уголовное дело по обвинению Блинковского Аркадия Александровича, 25 марта 1941 года рождения, уроженца дер. Шашки Ганцевичского района Брестской области, гражданина республики Беларусь, образование высшее, военнообязанного, не судимого, работающего главным инженером Западной поисково-съемочной партии Белорусской гидрогеологической экспедиции, проживающего в г. Барановичи, ул. Фабричная, д. 20-А, кв. 19., в совершении преступления, предусмотренного ст. 71 ч. 2 УК РБ

УСТАНОВИЛА:

Блинковский А.А., являясь редактором газеты "Барановичское слово", будучи должностным лицом, являясь ответственным за выпуск данной газеты, умышленно, с целью возбуждения национальной вражды и розни опубликовал в газете № 1(8) за декабрь 1993г. написанную им статью "Здрада", в которой содержатся антирусские высказывания, противопоставляются интересы русских и белорусов...

В судебном заседании Блинковский А.А. вину не признал и пояснил, что он является редактором газеты "Барановичское слово", органа товарищества белорусской мовы имени Франтишка Скорины. Он автор статей "З пошты газеты" и "Здрада", опубликованных в газете "Барановичское слово" № 7 за декабрь 1992г. и № 1(8) за декабрь 1993г. Опубликовав данные статьи, не имел умысла на разжигание национальной вражды и розни.

Допуская в статьях, возможно, не совсем корректные высказывания, ссылался на малоизвестные исторические факты. При этом указывает, что данные факты и статистические данные ранее публиковались в различных изданиях. В своих публикациях под "расейцами" он имел в виду руководящих работников, не зависимо от их национальной принадлежности.

Исследовав материалы дела судебная коллегия приходит к выводу, что вина Блинковского А.А. нашла свое подтверждение в судебном заседании.

Доводы Блинковского о том, что он не имел намерения разжигать национальную рознь, опубликовав статью "Здрада" в газете "Барановичское слово", несостоятельны, так как Блинковский является редактором газеты и автором статьи "Здрада", имеет высшее образование, определенный жизненный опыт, конкретные политические взгляды, а поэтому, допуская недвусмысленные выражения в отношении русских в статье, понимал, какое воздействие может оказать его статья на читателей, и, опубликовав ее, преследовал цель возбуждения национальной вражды и розни...

Органами предварительного следствия также в вину Блинковскому вменяется то, что в статье "Здрада" Блинковский употребляет призывы к ограничению прав граждан Республики Беларусь, заявляя, что "тым расейцам, каму папярок горла наша незалежнасць, нейтралітэт, мова, лепш выехаць з Беларусі. Расея вялікая, а мы торбу збяром на дарогу", предлагает провести в Республике Беларусь дерусификацию, которая должна касаться не только языка, но и распространяться на назначения на должности во всех учреждениях, которыми руководит "партия Кебича", а также допустил высказывания, что "расейскія камуністы, прыпершыся на Беларусь, узялі за моду мачыцца і сяліцца са скацінай у нашых царквах, касцёлах і палацах".

Судебная коллегия полагает, что данные высказывания и утверждения – это некорректная, нетактичная форма изложения мыслей автора, а не умышленные действия целенаправленного характера, за которые Блинковский может быть привлечен к уголовной ответственности, поэтому судебная коллегия исключает из обвинения данные указания.

Назначая наказание, судебная коллегия учитывает общественную опасность, тяжесть содеянного, данные, характеризующие личность подсудимого.

Судебная коллегия учитывает, что Блинковский А.А. впервые привлекается к уголовной ответственности, и считает, что Блинковскому следует назначить наказание в виде штрафа. Размер штрафа исчислен судебной коллегией на момент совершения преступления Блинковским, то есть время публикации статьи в газете, декабрь 1993 года.

Руководствуясь ст. 301-304, 314-316 УПК Республики Беларусь, судебная коллегия

ПРИГОВОРИЛА:

Блинковского Аркадия Александровича признать виновным в совершении преступления, предусмотренного ст. 71 ч. 2 УК Республики Беларусь.

Назначить Блинковскому А.А. наказание в виде штрафа в размере 25 (двадцать пять) тысяч рублей в доход государства.

5. КОММЕНТАРИЙ ЮРИСТА

В истории белорусской журналистики произошло нерядовое событие: признан виновным и осужден за уголовное преступление журналист – редактор газеты. И осужден не за то, что украл, нахулиганил, кого-то избил. Осужден за разжигание вражды и розни между целыми народами!

Вот оказывается, что может сделать журналист. Но коллеги это событие как-то не заметили. Может быть, не слышали: это дело было рассмотрено тихо и спокойно. Может быть, и слышали, но промолчали – посчитали, что оно не значимо, не увидели его уникальности. А оно уникально, и не только по составу или степени доказанности, а скорее потому, что воскресило из мертвых саму статью. Навряд ли кто-то вспомнит хоть одно подобное дело: никого еще не привлекали у нас к ответственности по этой статье, не считалось, что кто-то разжигает вражду между русскими и белорусами. Впервые это сделал журналист и открыл дорогу в судебную практику. Теперь это прецедент.

Специалисты знают, что эта статья очень опасна: она сложна по своей юридической природе. В ней предусмотрено, что человек совершает действия, направленные на возбуждение национальной или расовой вражды умышленно. Умысел – один из главных признаков статьи. Причем он должен быть прямой: виновный сознает, что своими действиями возбуждает вражду, знает и желает этого.

Но как правосудию определить: был ли у вас такой умысел? В юриспруденции есть два понятия: мотив и цель. Они очень важны, когда расследуются умышленные преступления. Не будет мотива, т.е. того, что побуждает к совершению действий, и цели, т.е. того, к чему вы стремитесь – не будет и умысла.

Однако, как теперь показала судебная практика, эти моменты особо и не выясняются. Суд может вполне обойтись и без них. Если у вас есть жизненный опыт и политические взгляды – этого достаточно, чтобы сказать, что умысел у вас был.

Конечно, можно предположить, что, имея определенные политические взгляды, журналист имеет и мотив к опубликованию материала. Но цель? Маловероятно, что она заключается в том, чтобы разжечь вражду между народами. Однако тот, кто оценивает журналистский материал (следователь, суд), подвергается опасности перепутать две цели: цель возбудить вражду и цель журналиста "поярче выразиться". И тогда нетактичная, некорректная форма изложения его мыслей может быть воспринята за умышленные действия целенаправленного характера. Поэтому журналисту, как бы он ни был в плену политических пристрастий, не стоит забывать, что его слово может обернуться против него же.

Наталья ДОВНАР, руководитель юридической службы Белорусского ПЕН-центра

6. МЕРКАВАННЕ "К"

Прапануем суперлаканічную фармулёўку Закона аб друку: калі дурнота, правінцыялізм, неінтэлігентнасць ёсць у жыцці, яны маюць права быць і ў СМІ пры ўмове, што СМІ не памнажаюць, а змяншаюць колькасць дурноты, правінцыялізму, неінтэлігентнасці ў жыцці. Газета "Баранавіцкае слова" – памножыла ў 999 раз (такім тыражом выйшаў артыкул А. Блінкоўскага "Здрада").

Рэдактар Блінкоўскі, падлічыўшы колькасць рускіх і беларусаў сярод эліты рэспублікі, у судзе спасылаўся на друкаваныя крыніцы. Ён меў рацыю, як мае рацыю п'яніца, спасылаючыся на той факт, што калі гарэлку прадаюць, то піць можна. Некалькі гадоў назад дамарошчаную, нематываваную, перавернутую "статыстыку" пра "дыспрапорцыю" беларусаў і рускіх у навуцы, культуры і ўладзе размножыла тыражом 600.000 экзэмпляраў "Народная газета". Адзін яе нумар папаў да Блінкоўскага -- і бачыце, як друкаваная дурнота атручвае чалавека безпадстаўнай нянавісцю да другога чалавека. А што нарабілі з людзьмі астатнія 599.999 нумароў той "народнай" газеты?

У грамадства бесцырымонна ўварвалася зграя СМІ, якімі кіруюць амбітныя неадукаваныя рэдактары. Яны грызуцца паміж сабой і правакуюць, каб і мы, чытачы, перакусаліся. У тых жа Баранавічах спачатку кусалі адно другое газета "дэмакратаў" "Баранавіцкае слова" і газета "камуністаў" "Товарищ". Затым сценка на сценку пайшлі "дэмакратычныя" і "камуністычныя" масы, нацкаваныя сваімі друкаванымі органамі. Кулём яны і ўкаціліся з палітычным брэхам у памяшканне суда.

Гэта быў не надта сур'ёзны палітычны працэс, што падцвярджае і смехатворны прыгавор. Можна было б і пасмяяцца над усёй гэтай гісторыяй, калі б не два істотныя моманты. Па-першае, пабольшала дурноты, і гэта сумна. Па-другое, пабольшала падстава ўлічыць журналістаў людзьмі несур'ёзнымі, а журналістыку – не прафесіяй з яе прафесійнымі канонамі, а сабачым заняткам: дзе захачу – папырскаю, дзе – пабрашу, дзе – кусну...

СВІНЦОВЫЯ ДЗЕЦІ

Марыя ФІЛІПОВІЧ

МІНСК. КОЖНАЕ ТРЭЦЯЕ ДЗІЦЯ ПЕРАНАСЫЧАНА СВІНЦОМ. ПАВЫШАНАЯ НАЯЎНАСЦЬ РТУЦІ Ў АРГАНіЗМЕ ВЫЯЎЛЕНА Ў 60% ДЗЯЦЕЙ. БОЛЬШ ЗА ЎСЁ ХВАРЭЮЦЬ ДЗЕЦІ Ў КАСТРЫЧНІЦКІМ І ЦЭНТРАЛЬНЫМ РАЁНАХ. ЗУСІМ ЗДАРОВЫХ ДЗЯЦЕЙ -- 11,4% -- 18,9%.

Медыка-экалагічны маніторынг здароўя дзяцей і падлеткаў бярэ свой пачатак у 1992-1993 гадах. К таму часу здароўе дзяцей пачало пагаршацца, гэтае пагаршэнне звязвалі з Чарнобыльскай аварыяй і, наогул, з нядобрай экалагічнай сітуацыяй, якая склалася ў горадзе. Вырашана было не проста даследаваць экалогію горада, а даць арыенціраваную адзнаку ўздзеяння экалагічнай нагрузкі такога вялікага прамысловага горада, як Мінск, на арганізм дзяцей.

Адначасова праводзілася заглыбленае даследаванне асобных груп дзяцей і вывучалася экалагічнае асяроддзе там, дзе яны жывуць і вучацца. Даследваліся атмасфернае паветра, вада, глеба – на ўтрыманне цяжкіх металаў і радыяцыю. У асноўным вывучаліся два кантрасныя раёны: Заводскі -- зона высокай экалагічнай рызыкі і раён Зялёнага Луга – зона рызыкі мінімальнай. Пад асобай увагай быў Цэнтральны раён горада, які па колькасці прамысловых прадпрыемстваў, інтэнсіўнасці аўтамабільнага руху і характару забудоў лічыцца экалагічна небяспечным.

***

Даследванне паветра паказала высокі ўзровень атмасфернага забруджвання ва ўсіх раёнах горада. Завіслымі часціцамі, дыяксідам серы, дыяксідам азота, аксідам вуглерода Мінск забруджаны больш, чым іншыя гарады былога СССР, дзе вядзецца аналагічная сістэма кантроля. Спецыфічным забруджвальнікам з'яўляецца свінец.

Пры аналізе пробаў глебы свінец, нікель, марганец, цынк, медзь, кадмій былі знойдзены практычна на ўсёй тэрыторыі горада. Дапускаецца, што, апрача іншых фактараў, на забруджванне наваколля свінцом паўплывала аварыя на Чарнобыльскай АЭС, калі металічны свінец выкарыстоўвалі, каб зменшыць выкід радыёактыўных рэчываў.

Больш за ўсё цяжкіх металаў знойдзена ў раёне рысорнага завода і ТЭЦ-3, а таксама паміж праспектам Ф. Скарыны і вуліцай М. Багдановіча. Калі гаварыць толькі пра забруджванне свінцом, то больш за ўсё яго ў Заводскім раёне (у 20 разоў вышэй дапушчальнай канцэнтрацыі). І як вынік – свінца больш за ўсё знайшлі ў арганізме ў школьнікаў, якія жывуць альбо вучацца ў Заводскім раёне. Наогул усе паказчыкі здароўя ў дзяцей з зоны высокай экалагічнай рызыкі былі значна горшымі, чым у дзяцей з Зялёнага Луга. Былі выяўлены парушэнні з боку сістэмы крыві, нырак, органаў дыхання, хранічныя гастрыты. Калі ж гаварыць пра імунітэт у дзяцей, то ён быў зніжаны ва ўсіх дзяцей, незалежна ад раёна пражывання.

***

Жыццё маленькага чалавека ў вялікім прамысловым горадзе бяспечным не назавеш. Нават калі ён вывучыць, як правільна пераходзіць вуліцу, і засвоіць дзесяткі іншых правіл, гэта яшчэ не гарантыя, што з ім нічога не здарыцца. Нябачныя ворагі ўсюды -- ў паветры, глебе, вадзе... Аэразольныя і парагазавыя формы свінца распаўсюджаны далёка ад месцаў іх выкіда, лёгка паглынаюцца раслінамі. У кожным каліве ўкропа, салата ці іншай гародніны, якую нашы мінчане вырошчваюць на гародзе ў прыватным сектары, можна знайсці свінец. А нашы гараджане гэта ядуць і радуюцца, што сваё.

Санітарна-эпідэміялагічная служба трымае на кантролі гаспадаркі, якія забяспечваюць горад садавінай-гароднінай. А ў кожнай бабулькі, якая гандлюе, дзе толькі захоча, хіба праверыш! Тым больш, што аналіз на ўтрыманне ў зелені свінца і ртуці ў нас робяць тры дні! Гэта за мяжой, з іх сучаснымі прыборамі, ўсё робіцца за лічаныя хвіліны.

***

У сучаснай медыцынскай навуцы вызначыўся новы накірунак – эндаэкалогія. Яна вывучае, як паводзіць сябе атрута, калі трапляе ў арганізм чалавека. Ці заўсёды ўсё канчаецца хваробай? Урачы прыйшлі да вывада, што і месца лакалізацыі, і характар паталагічнага працэса, які пры гэтым развіваецца, залежаць не столькі ад таксічнага агента, колькі ад агульнага стану здароўя дзіцяці.

Арганізм заўсёды ўступае ў "бой" з акупантам, і тут ўсё залежыць ад яго здольнасці мабілізаваць свае жыццёвыя сілы для абароны. Нягледзячы на супраціўленне, 80% свінца, які трапіў у арганізм, накапліваецца. Каб даведацца, ці атручана ваша дзіця свінцом, дастаткова ўзяць на аналіз яго валасок. Калі ў ім свінца больш 30,0—150,0 мкг/г – можна гаварыць аб хранічнай інтаксікацыі. Нават у гарадах з добрымі ўмовамі аэрацыі свінца ў валасах дзяцей у паўтара разы больш, чым у іх аднагодкаў, якія жывуць у сельскай мясцовасці.

Ртуць выводзіцца з арганізма яшчэ горш, чым свінец, і накапліваецца звычайна ў нырках. Трапіць у арганізм дзіцяці ртуць можа і ад бацькоў, калі яны працуюць з гэтым металам у вытворчых умовах. А гэта – хлоршчолачныя заводы, цэлюлозна-папяровыя камбінаты, лака-фарбавая прамысловасць, вытворчасць электраабсталявання, сталі, цэмента.

Шмат ртуці выдзяляецца пры спальванні выкапнёвага паліва. Устаноўлена, што павышэнне ртуці ў навакольным асяроддзі прыводзіць да захворванняў зобам у насельніцтва.

Эндаэкалагічную паталогію ў дзяцей дыягнастыраваць складана, таму што яна не мае ярка выражаных сімптомаў, маскіруецца пад іншыя захворванні. Дзіця робіцца млявым, хутка стамляецца. У яго ўжо пашкоджана імунная абарона, і да яго так і ліпнуць розныя прастудныя і інфекцыйныя хваробы. Затым яны пераходзяць у хранічную форму з частымі рэцыдывамі. Добра, калі на нейкім этапе лячэння адзін з урачоў здагадаецца праверыць дзіця на атручванне цяжкімі металамі.

***

Медыка-экалагічны маніторынг здароўя, у якім прынялі ўдзел НДІ радыяцыйнай медыцыны, "Эндаэкалагічны цэнтр", Упраўленне аховы здароўя Мінгарвыканкама, гарСЭС, распачалі, вядома ж, не дзеля цікаўнасці. На яго глядзелі, як на першы этап шматгадавой мэтавай праграмы. Апіраючыся на выніку даследванняў, можна было прыкінуць, у якім напрамку праводзіць іх далей, якія прыняць першачарговыя меры, каб знізіць негатыўны ўплыў на здароўе дзяцей экалогіі горада.

Праблема – экалогія прамысловага горада і дзеці -- існуе ва ўсім свеце. Ёсць два шляхі яе вырашэння: першы – паляпшаць экалогію, другі -- умацоўваць здароўе дзяцей, павышаць іх імунітэт.

Першы шлях патрабуе фундаментальных тэхналагічных і эканамічных рэканструкцый вытворчасці. На гэта трэба час і грошы. Мы да такіх перамен яшчэ не гатовы. У нас паляпшаць экалогію даводзіцца санітарна-эпідэміялагічнай службе, прымяняючы адміністратыўныя меры пакарання, якіх ніхто на баіцца. Гэтая служба не можа спыніць работу прадпрыемства, якое атручвае наваколле. Для гэтага ёй патрэбна юрыдычная база, а яе няма. Таму нашы прадпрыемствы працуюць як працуецца. Валавы выкід у год забруджваючых рэчываў у аўтамабільнага завода – 880т., у трактарнага – 152т., рысорнага – 103т., падшыпнікавага – 292т., аўтапарка №7 – 48т.

Колькі тон атруты выкідвае з сябе ў паветра іншы транспарт, можна толькі здагадвацца, дакладных лічбаў гарСЭС не мае. А наколькі лягчэй стала б нам дыхаць, каб раптам і ў нашай сталіцы, як у ва ўсім цывілізаваным свеце, патрабавалі прымянення каталізатараў на выхлапныя трубы ці забаранілі карыстацца этыляваным бензінам. Але, відаць, доўга нам яшчэ давядзецца чакаць, пакуль закон аб санітарна-эпідэміялагічным дабрабыце грамадзян, які быў прыняты 23.11.93 года, пачне дзейнічаць. Бо закон – гэта форма, у якую ўціскаюцца эканамічныя адносіны.

***

Як бачым, першы шлях вырашэння праблемы – паляпшэнне экалогіі горада – няпросты, патрабуе велізарных сродкаў. То, можа, лягчэй зрабіць пэўныя захады і ўмацаваць імунітэт дзяцей? Ці стануць цяжкія металы атрутай для дзіцяці, ці захварэе яно, залежыць перш за ўсё ад агульнага стану яго здароўя. У час даследвання высветлілася, што ў нас шмат дзяцей і падлеткаў з дэфіцытам у арганізме асноўных вітамінаў і мікраэлементаў. З гэтага і трэба пачынаць аздараўленне дзяцей, вырашылі ўрачы. З вітамінізацыі. Была і доза вызначана: кожны дзень па аднаму дражэ полівітамінаў. Ці можа наша дзяржава праявіць такі клопат аб сваіх маленькіх грамадзянах?

У аддзеле лячэбнай дапамогі дзецям і маці Упраўлення аховы здароўя Мінгарвыканкама мяне пазнаёмілі з такімі лічбамі: у Мінску дзяцей ад 1 года да 15 – 370 тысяч. Каб правесці толькі адзін курс вітамінізацыі, патрэбна амаль 15 мільярдаў рублёў. Начальнік аддзела Карына Анатольеўна Ласюк лічыць гэта нерацыянальнай тратай бюджэта. "Трэба павялічваць асабістую адказнасць за ўласнае здароўе і здароўе сваіх дзяцей, -- гаворыць яна. – Спадзявацца на дапамогу толькі дзяржавы – неразумна. У беднай дзяржаве і здароўе ў людзей беднае." Хочацца перайначыць: у хворай дзяржавы і людзі хворыя.

Удакладнім. Дзяржава не адмахнулася ад тых дзяцей, у каго ў арганізме выяўлены свінец і ртуць звыш дапушчальнай нормы. Іх аздараўленне праводзіцца ў дзённых стацыянарах пры паліклініках і ў дзіцячым санаторыі "Пралеска". Праўда, не ўсе туды могуць трапіць, каму гэта трэба: мала месцаў, а дзяцей многа.

ЛІЧБЫ І ФАКТЫ, ПРА ЯКІЯ ТУТ ГАВОРКА, ДАЎНО ВЯДОМЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТАМ. А ДЭПУТАЦКАЯ КАМІСІЯ ГАРСАВЕТА ПА ЭКАЛОГІІ, СТАРШЫНІ ПАСТАЯННЫХ КАМІСІЙ ПА ЭКАЛОГІІ І АХОВЕ ЗДАРОЎЯ УПРАЎЛЕННЯ МІНГАРВЫКАНКАМА ТОЛЬКІ Ў 1996 ГОДЗЕ ВЫЙШЛІ НА МЭРА ГОРАДА З ПРАПАНОВАЙ ЗАСЛУХАЦЬ НА ПАСЕДЖАННІ ГАРВЫКАНКАМА ВЫНІКІ МЕДЫКА-ЭКАЛАГІЧНАГА МАНІТОРЫНГА ЗДАРОЎЯ ДЗЯЦЕЙ ЗА 1992-1993гг., КАБ ВЫПРАЦАВАЦЬ ПРАГРАМУ ІХ АБАРОНЫ. МАЙЦЕ ГЭТА НА ЎВАЗЕ, БАЦЬКІ. ВАШЫ ДЗЕЦІ ДЗЯРЖАВЕ НЕ ПАТРЭБНЫ, ЯНЫ ПАТРЭБНЫ ВАМ.

ДРЭВА СВАБОДЫ НА КРЫВІ НЕ КВІТНЕЕ

Уладзімір АРЛОЎ



ЯГО КЛІКАЛІ ІГНАСЕМ. ХЛОПЧЫК ВЫЛУЧАЎСЯ ТАКОЙ ДАБРЫНЁЙ І РАХМАНАСЦЮ, ШТО НЕ МОГ ПАКРЫЎДЗІЦЬ НАВАТ КАТА, ЛЮБІЎ ЛАШЧЫЦЦА ДА МАЦІ, А КАЛІ АДНАГОДКІ ПРАПАНОЎВАЛІ ПАГУЛЯЦЬ У ВАЙНУ ЦІ Ў ПАЛЯВАННЕ -- АДМАЎЛЯЎСЯ. САМАЙ ВАЯЎНІЧАЮ З ЯГО ЗАБАВАЎ БЫЛА БЕГАНІНА ПА ЛУЗЕ З САЧКОМ У РУЦЭ, ПРЫЧЫМ ЗЛОЎЛЕНАГА МАТЫЛЬКА ЧАКАЛА ЗУСІМ НЕ ШПІЛЬКА І МЕСЦА Ў КАЛЕКЦЫІ, А ІМГНЕННАЕ ВЯРТАННЕ НА ВОЛЮ. ПРЫХАДЖАНКІ МЯСЦОВАГА КАСЦЁЛА ЗАМІЛАВАНА ГЛЯДЗЕЛІ, ЯК НА ІМШЫ МАЛЫ ІГНАСЬКА, ТРОХІ КАРТАВЯЧЫ ЛІТАРУ "Л", СТАРАННА ВЫМАЎЛЯЎ МАЛІТВЫ.

ЗА МЯККІ ЛАСКАВЫ ХАРАКТАР ГІМНАЗІЧНЫЯ СЯБРЫ ДАДУЦЬ ЯМУ МЯНУШКУ КОЦІК.

ПРАЗ ДВАЦЦАЦЬ ГАДОЎ КОЦІК (ТАК-ТАК, МЯНУШКА ЗАХАВАЕЦЦА) СА СПАКОЙНАЙ РАШУЧАСЦЮ НАБЛІЗІЦЦА НА НАБЯРЭЖНАЙ КАЦЯРЫНІНСКАГА КАНАЛА Ў ПЕЦЯРБУРЗЕ ДА ІМПЕРАТАРА АЛЯКСАНДРА II І, ВЕДАЮЧЫ, ШТО І САМ НЕ МАЕ НІЯКІХ ШАНЦАЎ УРАТАВАЦЦА, УСКІНЕ НАД ГАЛАВОЮ РУКІ З БОМБАЙ.

Але пакуль што дзяцінства: рэчка Белая, мурожныя паплавы, пачатак спрадвечнай пушчы... Сюды, у спадчынны маёнтак Вялікія Грынявічы Бельскага павета Гарадзенскай губерні, сям'я шляхціча Якіма Грынявіцкага вярнулася пасля таго, як аціхлі апошнія стрэлы паўстанцаў 1863 года. Ігнась нарадзіўся ў Басіне пад Бабруйскам, дзе бацька служыў эканомам. У не надта багатым доме гаварылі па-беларуску і па-польску.

Яго студэнцкае юнацтва звязана са сталічным Тэхналагічным інстытутам, куды найлепшы выпускнік Беластоцкай гімназіі быў залічаны ў 1875-м. Бліскуча здадзеныя экзамены і відавочныя схільнасці да навукі гарантавалі дыплом адной з самых прэстыжных вышэйшых школ імперыі і, як вынік, забяспечанае жыццё і рэальныя перспектывы ўпэўненага ўзыходжання па службовай лесвіцы.

***

Ішоў 1879-ты. Год, які шмат у чым стаў для расейскіх рэвалюцыянераў вырашальным. Год, калі вызначыў свой шлях і колішні хлопчык з мяккім і ласкавым характарам, які ніколі не гуляў у вайну.

Грынявіцкі з'явіўся ў сталіцы імперыі праз лічаныя гады пасля няўдалага замаху Дзімітрыя Каракозава. У аўдыторыях і на хатніх студэнцкіх балюшках зноў і зноў успыхвалі спрэчкі пра погляды галоўных ідэолагаў народніцтва.

Сяргей Нячаеў жыў фанатычнай вераю ў тое, што не сёння-заўтра Расею чакае новая пугачоўшчына. Рэальнае жыццё мала цікавіла арганізацыю пад адметнаю назвай "Народная расправа". Каб мацней звязаць таварышаў па падполлі, Нячаеў задумаў і здзейсніў зверскае забойства студэнта Іванова, беспадстаўна абвінавацілшы таго ў здразе.

Павел Ткачоў імкнуўся падвесці пад рэвалюцыйныя подзвігі тэорыю. Ён, у прыватнасці, лічыў, што пасля перамогі сацыялізму велізарная колькасць людзей – усё насельніцтва старэйшае за 25 гадоў -- будзе непрыдатнае да новага, шчаслівага жыцця з прычыны рэлігійных і маральных перажыткаў у свядомасці. Паводле гэтага тэарэтыка, усіх, хто, на сваё няшчасце, пераадолеў названую ўзроставую мяжу (апрача прафесійных рэвалюцыянераў), пажадана было б знішчыць, прычым моладзь мела шанец прадэманстраваць прыхільнасць "новаму разумнаму парадку", атрымаўшы пераважнае права на ліквідацыю бацькоў.

Студзень 1878-га. Вера Засуліч страляе ў обер-паліцмайстра Ф. Трэпава. У жніўні таго ж года Сяргей Краўчынскі забівае кінжалам шэфа жандармаў М. Мезенцава. "Тэарэтычная абгрунтаванасць" палітычных забойстваў, захапленне, якое выказвала тэрарыстам частка расейскай публікі, нястрымнае імкненне прыспешыць, падштурхнуць гісторыю – усё гэта павялічвала шэрагі безразважных герояў.

Дзеянне выклікала супрацьдзеянне. З жніўня 1878 года да жніўня 1879 года ў Расеі было пакарана смерцю 14 рэвалюцыянераў. Разгойдваўся крывавы маятнік тэрору і рэпрэсій.

Увосень 1879-га Ігнат Грынявіцкі ўступае ў новую арганізацыю "Народная воля", якая ў сваёй праграме сцвярджае, што "тэрарыстычная дзейнасць... мае на мэце падарваць аўтарытэт урадавай сілы, няспынна даваць доказы магчымасці барацьбы "супроць урада, падымаючы такім чынам рэвалюцыйны дух народа"...

Кіруючыся надзіва жывучым прынцыпам вызначэння нацыянальнасці жыхароў дарэвалюцыйнай Беларусі паводле іх веравызнання, нават некаторыя сучасныя аўтары называюць Грынявіцкага палякам. У гэтым з імі салідарныя энцыклапедыі -- "Большая Советская", "Историческая". "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя" ўнікліва паведамляе толькі, што рэвалюцыянер паходзіў з дробнамаянтковых дваран. Разам з тым народнік Леў Ціхаміраў успамінаў: "Палякі ўпарта называлі яго Грынявецкі і прылічалі да сваіх. Аднак сам ён зваў сябе ліцвінам, а не палякам." Каб канчаткова закрыць "нацыянальнае пытанне", адзначым, што выдаўцы гектаграфічнага часопіса "Гомон" (ён выходзіў як падпольны орган беларускай фракцыі "Народнай волі" і на сваіх старонках неаднаразова пісаў пра існаванне беларускай нацыі) называлі Грынявіцкага "адным з гарачых заснавальнікаў сваёй справы".

***

30 траўня 1880 года Ігнат пакідае інстытут і, перайшоўшы на нелегальнае становішча, робіцца віленскім мешчанінам Ельнікавым. Прыхільнік крайніх метадаў, ён уступае ва ўзначаленую Соф'яй Пяроўскай групу, якая з дня ў дзень сачыла за выездамі цара...

Аляксандр II заняў трон ужо ў сталым узросце, у часе Крымскай вайны, якая скончылася для Расеі ганебнай паразаю. Усведамляючы катастрафічнае адставанне атрыманай у спадчыну краіны ад еўрапейскіх дзяржаў, новы імператар пайшоў, як вядома, на скасаванне прыгону і іншыя рэформы, якія, аднак, не атрымалі належнага працягу.

Для народавольцаў менавіта цар увасабляў усё зло самаўладдзя, хоць, па сутнасці, краінаю ад імя Аляксандра кіраваў вялізны феадальна-бюракратычны апарат. Грынявіцкі разам з іншымі рэвалюцыянерамі з Беларусі мог выстаўляць імператару і "асабісты" рахунак: дзесяткі пакараных смерцю і тысячы асуджаных на зняволенне, выгнанне паўстанцаў 1863 года, забарона беларускага друкаванага слова, ліквідацыя ў беларускіх губернях вышэйшай школы...

Смяротны прысуд Аляксандру "Народная воля" зацвердзіла ў жніўні 1879-га. У лістападзе была замініравана чыгунка пад Аляксандраўскам, аднак пад адхон пайшоў не царскі цягнік, а эшалон з прыдворнымі. У лютым 1880-га Сцяпан Халтурын узарваў магутны дынамітавы зарад пад царскай сталовай. Імператар з гасцямі на колькі хвілінаў затрымаўся на абед і застаўся жывы. Ахова, рабочыя і слугі ў разлік не прымаліся. Забойства Аляксандра II ператварылася для рэвалюцыянераў у самамэту, у справу асабістага гонару, у паляванне на чалавека

20 лютага того ж года дваццаціпяцігадовы ўраджэнец Слуцка Ігнат Маладзецкі няўдала страляў у графа Лорыс-Мелікава і ўжо праз два дні быў павешаны.

Разам з арыштамі і смяротнымі прысудамі ўлады шукалі іншыя шляхі. Міністр унутраных спраў Лорыс-Мелікаў ужо падрыхтаваў цару даклад аб "завяршэнні вялікай справы дзяржаўных рэформаў". Узнікла магчымасць руху Расейскай імперыі да канстытуцыі. Яшчэ раней была аслаблена цэнзура, скасавана III аддзяленне.

Тым часам "Народная воля" рыхтавалася да сёмай спробы царазабойства. "Крывавае нецярпенне" (Ю. Трыфанаў) нарастала з кожным днём. З 47 рэвалюцыянераў, гатовых ахвяраваць жыццём, А. Жалябаў выбраў чатырох, сярод якіх быў і Коцік.

У тыя ліхаманкавыя дні Грынявіцкі здолеў на тры дні вырвацца з Пецярбурга на радзіму. Сястры Юлі ён запомніўся вясёлымі жартамі і выдатна пашытым гарнітурам. Ігнат наведаў магілу маці, чытаў, слухаў бацькаву скрыпку. Для сям'і ён па-ранейшаму заставаўся сталічным студэнтам, гонарам і надзеяю роду.

26 лютага ў пецярбургскай кватэры Грынявіцкага на Сімбірскай адбылося адно з апошніх пасяджэнняў змоўшчыкаў. Магчыма, якраз у той вечар ён напісаў свой запавет: "Аляксандр II павінен памерці. Раскошнае дрэва свабоды вымагае чалавечых ахвяраў..."

***

Раніцай 1 сакавіка 1881 года імператар быў у добрым гуморы. Ён доўга гуляў з жонкаю і дзецьмі па Зімовым палацы, потым падпісаў дакумент пра дзяржаўную рэформу і сабраўся ехаць у Міхайлаўскі манеж на развод гвардыі. Жонка і Лорыс-Мелікаў адгаворвалі імператара, але ён адказаў, што знаходзіцца ў сваёй сталіцы, а не ў вотчыне рэвалюцыянераў. Адзіным вынікам угавораў была змена маршрута: царскі экіпаж скіраваў не на Малую Садовую, пад якой чакаў замініраваны падкоп, а на набярэжную Кацярынінскага канала.

Узмахам хусцінкі Соф'я Пяроўская апавясціла тэрарыстаў, што ўступае ў сілу запасны варыянт. Чацвёра з бомбамі на адлегласці трыццаці крокаў адзін ад аднаго занялі пазіцыі на набярэжнай. Да паловы трэцяй, калі паказалася царская карэта, адзін з гэтых чатырох, рабочы Цімафей Міхайлаў, чалавек велізарнай мужнасці (ён засведчыць гэта паводзінамі на судзе і на эшафоце) не вытрымае і пакіне сваё месца.

Нумарам першым стаяў былы студэнт Мікалай Рысакоў. Пасля выбуху яго бомбы цар застаўся жывы. Ён выйшаў з экіпажа і падышоў да схопленага тэрарыста. "Слава Богу, я уцелел," – прамовіў Аляксандр. "Не знаю, слава ли еще Богу," – злавесна прамовіў Рысакоў. (Ужо з першых допытаў ён пачне выдаваць і заявіць пра згоду стаць правакатарам, але ўсе роўна скончыць жыццё на эшафоце.)

Пакуль адбываўся кароткі дыялог паміж Рысаковым і Аляксандрам, Грынявіцкі наблізіўся да імператара амаль усутыч і ўзарваў свае бомбы...

Цар і яго забойца амаль поруч сядзелі на снезе. Вакол ляжалі параненыя, валялася зброя, адарваныя эпалеты, шматкі чалавечых целаў. Трэці тэрарыст, Іван Емяльянаў, спрабаваў дапамагчы цару.

Смяротна параненага імператара павезлі ў Зімовы палац. Хутка шматтысячны натоўп убачыў, як царскі штандар паўзе долу. Гэта азначала, што цара няма.

Тым часам у прыдворным Канюшаным шпіталі пакутліва паміраў царазабойца. За гадзіну да смерці да Грынявіцкага вярнулася прытомнасць. Прысутны пры ім следчы страпянуўся: "Імя! Імя! Мне трэба ваша імя!" Тэрарыст вымавіў толькі два словы: "Не ведаю..." Ягоную асобу паліцыя здолела ідэнтыфікаваць толькі ў красавіку...

***

Для тых, хто схільны захапляцца асабістай мужнасцю і канспірацыйнымі здольнасцямі тэрарыста № 1, можна нагадаць, што ў той сакавіцкі дзень на Кацярынінскім канале смяротныя раны атрымалі таксама казак з аховы, чатырнаццацігадовы хлопчык і жанчына-салдатка. Шэсць чалавек былі цяжка параненыя, адзінаццаць – лёгка. Некалькі выпадковых прахожых страцілі зрок, слых, засталіся калекамі.

Імперыя прысягнула Аляксандру III. Завяршылася палітычная кар'ера не толькі графа-рэфарматара Лорыс-Мелікава, але ўсіх больш-менш ліберальных міністраў, на змену якім прыйшлі адкрытыя рэакцыянеры-абскурантысты.

Савецкія гісторыкі, па сутнасці, кананізавалі думку, што Ленін і бальшавікі асуджалі абраныя "Народнай воляй" сродкі змагання за светлую будучыню. Аднак гэтае сцверджанне патрабуе ўдакладнення. Дазволім зрабіць яго непасрэдна "самаму чалавечнаму чалавеку": "Яны паказалі найвялікшую самаахвярнасць і сваім гераічным тэрарыстычным метадам барацьбы здзівілі ўвесь свет. Несумненна, гэтыя ахвяры былі недарэмныя, несумненна, яны спрыялі далейшаму рэвалюцыйнаму выхаванню расейскага народа". Гэты "гераічны" метад возьмуць на ўзбраенне і самі камуністы, пачаўшы з царскай сям'і і закончыўшы гулагамі.

У сваім запавеце Грынявіцкі марыў пра тое, каб "пачаты рух скончыўся перамогаю, а не татальным вынішчэннем лепшых людзей краіны".

Чым скончыўся рэвалюцыйны рух ў Расеі ў XX стагоддзі, нам добра вядома. Нешматлікія народавольцы, якім пашчасціла (?) дажыць да савецкай улады, на свае вочы ўбачылі, якімі метадамі пачынаецца будаўніцтва "новага справядлівага грамадства". Цяпер "раскошнае дрэва свабоды" патрабавала чырвонага тэрору, грамадзянскай вайны, генацыду свайго ж народа...

Зрэшты, XX стагоддзе яшчэ не завяршылася.

Фота: *Ігнат Грынявіцкі (1885-1881)*

КАЛІ ЧАЛАВЕК НЕ ЗДАЕЦЦА – – ЧАЛАВЕКА ЗНІШЧАЮЦЬ

Валянцін ТАРАС

Відаць, ужо набіла аскому выказванне, якое прыводзілася не аднойчы: "Гісторыя паўтараецца, але калі ў першы раз гэта трагедыя, то ў другі раз – фарс". Правільна, аднак не суцяшае, бо якая мне розніца, з'яўляюся я міжвольным персанажам трагедыі, ці мяне ўцягнулі ў фарс? Кроў застаецца крывёю, кулі кулямі, кайданы кайданамі. Нават калі яны партатыўныя, зробленыя з легкага сплаву, гэтакія прыгожыя кайданікі, якія, узышоўшы 15 сакавіка 1996 года на трыбуну Дзяржаўнай Думы Расіі, вынуў з кішэні і паказаў дэпутатам палітычны камедыянт, той самы, у якога "мама руская, а тата юрыст". Паказаў і сказаў, што неўзабаве такія вось кайданікі надзенуць на ўсіх, хто "разваліў вялікі Савецкі Саюз", а таксама на ўсіх тых, хто ім патурае.

Дума, толькі што прыняўшая пастанову аб адмене Белавежскіх пагадненняў, паблажліва рагатала, не задумваючыся, што заўтра, магчыма, ёй прыдзецца плакаць крывавымі слязьмі, што з яе самой яшчэ пасмяецца гісторыя. Ва ўсе часы гісторыя трасецца ад смеху над людскім забыццём, над чалавечай беспамятлівасцю. Я глядзеў на тэлеэкран, на камуністычна-жырыноўскі балаган, які разыгрываўся ў расійскай Думе, і з горыччу думаў, што мае ўспаміны аб савецкім жыцці, эпізоды маленства і юнацтва, ды і сталага веку, зноў становяцца злободзённымі, дарэмна я пераконваў сябе, што гэта ўжо назаўсёды адыйшло ў нябыт.

ШПІЁНКА

Тым летам 1937 года арыштавалі ксёндза касцёла святога Роха на Залатой Горцы, а касцёл закрылі. Увесь Менск поўніўся чуткамі, што ксёндз аказаўся польскім шпіёнам, што ў капліцы, якая стаіць нападалёк ад касцёла, ён хаваў зброю і радыёперадатчык, што -- і гэта асабліва ўражвала! -- пад капліцай знайшлі падземны ход, які вядзе ў самы цэнтр горада, да будынку польскага консульства, куды ксёндз і перапраўляў свае шпіёнскія данясенні.

Мая бабуля Гэля лічыла, што ўсё гэта бздуры, што папольску значыць лухта, -- "Божа літасцівы, якія сакрэты мог перадаваць ксёндз? І куды падзелася тая гара зямлі, якую трэба было вынуць, каб пракапаць падземны ход аж да консульства! Гэта ж тры кіламетры, калі не болей!" Ды што б там ні казала мая бабуля і іншыя людзі, якія кіраваліся звычайным здаровым сэнсам, мы, хлапчукі Трамвайнага завулка, былі ўзрушаны да глыбіні душы і не сумняваліся, што ўсё гэта праўда. Адно нам карцела: як гэта мы, кожны дзень бавячыся на Залатой Горцы, на старых каталіцкіх могілках, каля той капліцы, нічога не заўважылі? Чаму мы аказаліся такімі лапухамі? Вось каб гэта мы знайшлі той падземны ход і выкрылі ксёндза-шпіёна!

І так нам хацелася злавіць, выкрыць якога-небудзь шпіёна, ворага народа, што калі адзін з нас, самы старэйшы, чатырнаццацігадовы Лёнька Рублёў сказаў, што ён ведае, каго трэба выкрыць, мы, як маладзенькія гончыя шчанюкі, з радасцю натапырылі вушы. А выкрыць, сказаў Лёнька, трэба было старую Кульбацкую, жабрачку, якая час ад часу паяўлялася ў нашым двары. Гэта была не зусім звычайная жабрачка, не проста пабіраха. Пані Кульбацкая (так называла яе мая бабуля) наносіла візіты адным і тым жа людзям, адзін раз на тыдзень, на правах, так бы мовіць, старой знаёмай. Яна не прасіла -- ёй давалі самі, пачаставаўшы перад гэтым гарбатай. Мая бабуля дык нават ручку цалавала пані Кульбацкай, непрыкметна сунуўшы ёй у далонь рубель. І кожны раз, калі пані Кульбацкая зачыняла за сабой дзверы, бабуля ўздыхала: "Езус найсвенты, така была некалі прыгожая кабета! Маладая, багатая!" (Некалі -- азначала да рэвалюцыі.)

Вось на яе мы і нацэліліся. Лёнька Рублёў казаў, што яна, напэўна, шпіёнка, што яна не можа не быць шпіёнкай, бо была раней сапраўднай пані, дачкой домаўладальніка. Дагэтуль у аксамітавым капялюшы ходзіць, у пальчатках і з парасонам! Трэба прасачыць за ёй, за кожным яе крокам: куды ходзіць, да каго, ці не бывае каля польскага консульства. Калі будзем доўга і старанна сачыць, то абавязкова выкрыем яе як шпіёнку. Пападзецца на чым-небудзь. І мы, ватажка хлапчукоў, пачалі штодзень хадзіць за пані Кульбацкай інтэгральна па пятах...

Кабета заўважыла, што тыя ж самыя дзеці ходзяць за ёй, сочаць за кожным яе крокам, спрабавала некалькі разоў загаварыць з намі, відаць, спытацца, чаму, навошта мы за ёй ходзім. Але мы, калі яна спынялася і звярталася да нас, разбягаліся ў розныя бакі, а потым зноў упарта ішлі за ёю.

І аднойчы да маёй бабулі прыйшла ўзрушаная суседка, старая Грынкевічыха, і з парога выбухнула навіной: "Ці ведаеш ты, што ўчора ўвечары Кульбацкая скончыла жыццё самагубствам? Кінулася пад трамвай!.. Чаму? Ніхто не ведае, чаму. Відаць, абрыдла ёй такое жыццё... Адна, без кала, без двара... Хворая, нікому непатрэбная..."

Лёнька Рублёў, даведаўшыся пра гэтую навіну, рагатнуў: "Ад страху пад трамвай кінулася!.. Зразумела, што не сёння-заўтра мы яе падловім! От гадаўка!"

А яшчэ праз колькі дзён папаўзлі чуткі, што пані Кульбацкая, ну, гэта жабрачка ў капялюшы, аказваецца, была шпіёнка, уваходзіла ў тую хэўру, што і залатагорскі ксёндз. Энкэвэдэ выйшла на яе сляды, вось яна і кінулася на рэйкі. А на гарышчы, у нейкім доме на Цнянскай, дзе была яе бярлога, знайшлі цюфяк, набіты грашыма. Вось табе і жабрачка!"

ГУМАНІСТ

Каля вёскі Нелюбы, што недзе ў Валожынскім раёне (калі я не памыляюся праз столькі год), у сакавіку 1944 года загінулі двое партызан з нашага атрада. Нарваліся на паліцэйскую засаду, калі ішлі ў вёску, да аднаго дзядзькі, у якога пакінулі сваіх коней. Нехта падказаў паліцаям, што партызаны абавязкова прыйдуць за коньмі. І паколькі той дзядзька лічыўся абсалютна сваім чалавекам, то наш начальнік штаба атрада, П.Б-каў (прозвішча не называю, бо ў яго засталіся дзеці і ўнукі, іх і шкадую – не яго) вырашыў, кіруючыся класавай свядомасцю, што паліцаяў навёў староста.

Памятаю, што прозвішча старасты было Нелюб, як і ў многіх у той вёсцы. Начальнік штаба правёў допыт гэтага чалавека ў ягонай жа хаце, у прысутнасці жонкі і дзяцей. Староста рашуча адмаўляў сваю віну, бажыўся, кляўся, што ніякіх паліцаяў ён не наводзіў. А Б-каў толькі налівался крывёю ад злосці, ад таго, што такім упартым аказаўся гэты класавы вораг. Памятую, як адна за дачок Нелюба, відаць, старэйшая, прашаптала матцы: "Застрэліць тату гэты гарбаносы..." (Я, хлапчанё-партызан, быў побач, усё чуў.)

Начальнік штаба загадаў Нелюбу выйсці на ганак, і там, на ганку, застрэліў яго трыма стрэламі з нагана. У патыліцу. Чалавек паваліўся, нават не войкнуўшы. І ніхто не войкнуў, не закрычаў -- ні хтонебудзь з радні, ні аднавяскоўцы, якія невялічкім натоўпам стаялі непадалёк ад ганку. А начальнік штаба загадаў ардзінарцу падвесці яму каня, ускочыў ў сядло, паправіў кабур нагана, шапку, і прыўзняўшыся на страмёнах, крыкнуў людзям: "Жители, закопать! И позаботьтесь о детях. Дети не виноваты!"

І паскакаў па вясковай вуліцы галопам.

КАЛІ ЧАЛАВЕК НЕ ЗДАЕЦЦА...

Пра гэта мне, і не толькі мне, расказваў Рыгор Бярозкін, выдатны беларускі літаратурны крытык, былы вязень Гулага, пасаджаны ў 1939 годзе. У 1941-ым, якраз у чэрвені, яго прывезлі з Поўначы ў Менск, на пераследства, бо ён увесь час пісаў скаргі, што пасадзілі яго нізавошта, што ніякі ён не вораг народа, не буржуазны нацыяналіст. Пачалася вайна, і ўсіх палітычных вязняў, каб не валтузіцца з імі, вывелі з турмы (адбывалася гэта ў горадзе Чэрвень) і пакалалі з кулямётаў.

Бярозкіну ўдалося ўцячы. Ён далучыўся да нейкай вайсковай часці, зрабіўся яе байцом, адступаў з ёю аж да Масквы, удзельнічаў у абароне сталіцы СССР, потым ваяваў на Сталінградскім фронце, быў двойчы паранены, атрымаў некалькі баявых ордэнаў, медаль "За отвагу". Вайну закончыў у Берліне. А ў 1947-ым яго зноў узялі, дабавілі да ранейшага "срока" яшчэ дзесятку – за ўцёкі з месца зняволення! І ўсё пачалося па новай.

Следчы, які вёў яго справу, на адным з допытаў прывязаўся да Рыгора Саламонавіча з такім пытаннем: "Вот ты писатель, да? Все знаешь, да? Вот и скажи мне, падло, что Максим Горький говорил о человеке? Ну? Что?" Бярозкін адказаў: "Гэта агульнавядомае выказванне. Горкі сказаў, што чалавек – гэта гучыць горда..." Следчы ўскочыў з крэсла, падбег да Бярозкіна і сунуў яму пад нос дулю: "Хера! Горький сказал, что если человек не сдается – его уничтожают! Понял, сука?!" Бярозкін адважыўся запярэчыць: "Наколькі я памятаю, Горкі сказаў, што калі вораг не здаецца – яго знішчаюць..." І тады следчы закурыў папяросу, пусціў дым у столь і спакойна, з усмешачкай, сказаў: "А человек и есть враг. Каждый! Понял? Ты, например. Так что колись, гад!"

ГЭТА НАШЫ ОРГАНЫ!

У жніўні 1968-га са мной праводзілі "прафілактычную размову" у КДБ. Супрацоўнік, да якога мяне прывялі, быў далікатны. Голас не павышаў, не пагражаў, цікавіўся, над чым я працую, колькі зарабляю, якая ў мяне сям'я. Ён, бачыце, не ведаў, якая ў мяне сям'я, не ведаў нават, дзе я працую!

Вядома, цікавіла яго зусім іншае. А менавіта тое, хто даў мне для прачытання пісьмо Аляксандра Салжаніцына да ўсіх пісьменнікаў, хто яго размножыў на машынцы, што я магу сказаць пра таго-та і таго-та. І хоць мяне вучылі, той жа Рыгор Бярозкін, у размовы з супрацоўнікамі КДБ не ўвязвацца, ніякай ініцыятывы не праяўляць, а проста слухаць і адказваць альбо не адказваць на пытанні, у залежнасці ад таго, чаго яны тычацца, і не вытрымаў і спытаў: "А чаму вы кажаце – паклёпніцкія? Што ў іх паклёпніцкага? Хіба на Лубянцы, у сталінскіх лагерах, не катавалі людзей, не здзекваліся з іх? Хіба мільёны не былі асуджаны несправядліва? Вы ж самі гэта прызналі на XX з'ездзе КПСС!"

І што мне адказаў той кадэбіст? Ён вылупіў вочы і амаль малітоўна, урачыста сказаў: "Але ж гэта былі нашы савецкія органы! Як можна крыўдзіцца на іх, калі вы савецкі чалавек? Вам павінна быць балюча за іх! Але ганіць іх нельга, як нельга ганіць бацьку, калі ён нават і несправядліва дасць вам па срацы. Бо для вашага ж дабра ў любым выпадку! А Салжаніцын ненавідзіць! І вы, як мне здаецца, ненавідзіце. За што?!"

Слухаючы гэту дзіўную прапікнёную тыраду, я згадаў эпізод з нейкай дакументальнай кніжкі пра гітлераўскія лагеры смерці, расповяд пра тое, як дзяўчына-яўрэйка, праходзячы селекцыю, выхапіла з рук эсэсаўца, які стаяў побач з ёй, пісталет і стрэліла яму ў жывот. Той схапіўся за рану і з вялікім здзіўленнем спытаў: "За што? Бог мой, за што?!" Ведаючы, што іду на рызыку, я ўсё ж пераказаў гэты эпізод майму кадэбэшніку. І што? Ён недаўменна пацiснуў плячыма: "Пры чым тут нямецкія лагеры смерці? І яўрэйка нейкая... Я вас не разумею!"

Думаю, што нічога ён не зразумеў і па сённяшні дзень.

ДРУГОЕ ВОКА

Нічога не магу з сабой зрабіць: гляджу на камуністычны вэрхал у Думе, у нашым ВС - і ўспамінаю, успамінаю жахлівае...

Успамінаю, як ва ўніверсітэце камуніст-інтэрнацыяналіст Іван Гутараў, прафесар філалогіі, змагаўся з "бязроднымі касмапалітамі", як урываўся з магнітафонам на лекцыю дацэнта Касоўскага, цікага, разумнага, інтэлігентнага чалавека, і крычаў яму голасам базарнага скандаліста: "Ты, касмапаліцкае бязроддзе, чытай сваю антысавецкую лухту ў мікрафон!"

Успамінаю, як пасля арышту ўрачоў, гэтых "забойцаў у белых халатах", калі ўся краіна захлыналася ў антысяміцкай гістэрыі, намеснік галоўнага рэдактара газеты "Сталінская молодежь" (цяпер "Знамя юности") нездаступна, як цень, хадзіў за супрацоўнікам рэдакцыі, былым франтавіком Барысам Пшонікам, баючыся, каб той не атруціў газету якім-небудзь не тым матэрыялам, нават у вярстальны цэх за ім ішоў следам, калі Пшонік дзяжурыў. Барыс Міхайлавіч не вытрымаў і сказаў: "Як табе не сорамна, Саша? Мы ж абодва франтавікі, ты столькі гадоў мяне ведаеш! Чаму ж ты мне не верыш?" Камуніст-інтэрнацыяналіст адказаў: "Ну, чаму? Табе я веру, а вось нацыянальнасці тваёй – не! Я для тваёй жа карысці сачу за табой, каб засцерагчы цябе ад памылкі. Разумееш?"

ЯК ТАМ, У ПРЫМАЎЦЫ, СКАЗАНА? ХТО СТАРОЕ ПАМЯНЕ, ТАМУ ВОКА ВОН? АДНАК У ГЭТАЙ ПРЫМАЎКІ ЁСЦЬ ПРАЦЯГ: А ХТО ЗАБУДЗЕЦЦА ПРА СТАРОЕ, ТОЙ І ДРУГОЕ ВОКА СТРАЦІЦЬ.

МЫ УСТАЛИ

Мария ФИЛИППОВИЧ

МНОГО РАБОТАЕМ?

Если быть честными с самими собой, то каждый из нас вспомнит в своей жизни времена, когда приходилось "вкалывать" по-настоящему, а усталости такой не ощущалось. Откуда-то шел поток жизненных сил, и на этой волне легко преодолевались любые трудности. Когда мы сегодня начинаем жаловаться друг другу на усталость, то, конечно, понимаем, что вызвана она не тяжелой физической работой. Еще в начале века учеными было доказано, что тяжелая физическая работа редко вызывает усталость, которую нельзя было бы снять хорошим сном или отдыхом.

Возможно, нас сильно утомляет умственная деятельность? Американские ученые провели эксперимент с исследованием крови. Оказалось, что кровь, проходящая через мозг, когда он находится в активном состоянии, совершенно не отражает его утомления. Наш мозг может работать так же хорошо и так же быстро в конце рабочего дня, как и в начале.

Откуда же наша всеобщая усталость?

Наши отцы и деды жили во времена революций и войн. Времена смертельные. Решали трудные задачи, которые ставила перед ними жизнь. Другие народы на земле в разные периоды своей жизни тоже переживали кризисы и возрождения. Но они не уставали так, как мы, в конце двадцатого века. Мы тешим свое самолюбие тем, что живем в особенное время, что наше поколение переживает особые потрясения и разочарования. Да. Но в чем истинная причина наших депрессий, усталости и болезней?

ЖИЗНЬ – ЭТО ЭНЕРГИЯ

Чтобы понять, почему же нам не хватает сил, чтобы жить и радоваться жизни, нам следовало бы хоть немного ознакомиться с теми законами, которые существуют в природе и согласно которым происходит обмен энергией на Земле и в Космосе. Наше видение мира основывается главным образом на той информации, которую мы получаем с помощью наших пяти чувств.

К сожалению, наши чувства ограничены, а значит, ограничено и наше видение мира. Мы постоянно окружены волнами энергий, которые используются в радио, телевидении, переговорных устройствах и многих других аппаратах связи. Мы не чувствуем присутствия этих волн, потому что наши органы чувств не способны принимать эти сигналы. Но это не значит, что их нет.

Точно также дело обстоит и со всеми природными и человеческими связями. Мыслители и мудрецы древности поняли, что твердая материальная жизнь является всего лишь энергией – вибрациями определенного качества, которые наши ограниченные чувства улавливают в виде твердой формы.

Греки 2500 лет назад предположили, что мир состоит из атомов, а атомы – энергия в движении. Это затем подтвердила физика. Нам кажется, что тело человека плотное, тяжелое. Иллюзия возникает за счет скорости движения электронов вокруг ядра. Жизнь – это энергия, наше тело – сгусток энергии. Когда мы делаем какую-то работу, мыслим, разговариваем, смеемся, спорим, ссоримся – мы излучаем из себя в окружающее пространство энергию определенного качества. чтобы чувствавать себя всегда бодрыми и жизнерадостными, мы должны израсходованную энергию восполнить. Если мы чувствуем себя усталыми, подавленными, значит, мы ее, энергию, не получаем обратно. Почему же так происходит?

КАК ЛЕТАТЬ С ВЫКЛЮЧЕННЫМ ДВИГАТЕЛЕМ

За ответом отправимся к... пенсионеру.

Наверно, каждый из нас удивлялся тем переменам, которые происходят с нашими знакомыми, вышедшими на заслуженный отдых. Они потухают. Их покидают силы и мечты. А еще вчера они были, казалось, неистощимы.

Вчера они работали – вот в чем дело. На работе мы тратим энергию. Взамен получаем признание, уважение, подкрепленное зарплатой. Если обмен равноценный, мы чувствуем удовлетворение. Если нам чего-то не додают, мы этого удовлетворения не имеем. Возникает чувство обиды, досады, опустошенности. Мы, вроде, выкладываемся на полную силу, а нам недоплатили или нас не заметили, не отметили, не поблагодарили. Зачем нам это надо?

Слова, мысли, чувства несут определенную энергетику, через них в нас вливаются жизненные силы, если они вызывают у нас положительные эмоции. Они же и отнимают у нас эти силы. Для нашего самочувствия небезразлично, что говорится вокруг нас, какие слова звучат, какие лица у людей, хмурые или улыбчивые, какие эмоции выплескиваются. Мы впитываем в себя все это, как губка, и тем самым или пополняем свои жизненные силы, или теряем их.

После выхода на пенсию, оказавшись "не у дел", люди вдруг начинают чувствовать резкий отток жизненной энергии. Человек не просто уходит с прежнего места работы. При этом прерывается невидимая энергетическая пуповина между ним и эгрегором того предприятия, где он работал.

Эгрегор – это сгусток энергии или энергетический центр, образованный в результате объединения людей, подобных по роду мыслей. Люди, работающие на каком-то предприятии, не могут не думать о нем, мысленно мы всегда связаны со своей работой. Родственные мысли легко притягиваются в пространстве друг к другу, образуя энергетический сгусток. Чем больше людей думают об одном и том же, тем большим и сильным становится эгрегор. Он, в свою очередь, питает людей, породивших его, жизненной энергией.

Когда человек уходит с работы или лишается ее, он отключается от прежнего эгрегора. Ему нужно некоторое время, чтобы подключиться к новому, стать частицей нового коллектива, жить его проблемами и заботами. Поэтому мы всегда чувствуем себя неуютно на новом месте, нас буквально тянет на прежнее.

Легче преодолевает кризис тот, кто быстро сумеет найти новое дело, которое бы захватило его полностью, будь то художественная самодеятельность, туризм, разведение кактусов или другое хобби. Многие убежденные атеисты становятся вдруг верующими, начинают посещать церковь, у них появляются новые друзья. Таким образом они подключаются к мощному религиозному эгрегору. Это обеспечивает им приток свежих сил и здоровья.

Коммунистическая партия, требуя от нас единомыслия, направляла наши мысли и душевные порывы к единому эгрегору. Мы работали на него, из него черпали свои жизненные силы. И нам было легче, чем сейчас.

Когда народ живет, сплоченный какой-то идеей – национальной, освободительной, духовного возрождения, -- он может свернуть горы. Наш жизненный тонус долго питался из эгрегора, созданного идеей революции, построения нового общества. Мы были едины в своем устремлении сбросить с себя фашистское иго, едины в желании восстановить разрушенную войной страну. Сейчас мы иронически улыбаемся, вспоминая все эти демонстрации, маевки, ударные стройки, соцсоревнования. Не будем давать оценку этим явлениям – мы этим жили. Нас лечила идея, общая цель. А сейчас нам жить нечем. Нет эгрегора. Его предстоит создать сообща, всем обществом. Родить цель, которая не только сплотит нас, но и вылечит.

Молодежь перекачивает свою энергию в эгрегор жестокости и похоти – и получает от него подпитку. Эта энергия низкого качества, она разрушает. Те, кто не может жить такой черной энергией, пытаются подключиться к духовному эгрегору. А многие твердят: "Мы устали, поэтому нам ничего не интересно". Но если быть точным, то все происходит наоборот: усталость приходит тогда, когда теряется интерес к любым проявлениям жизни.

КАК ВЫЙТИ ИЗ СОСТОЯНИЯ УСТАЛОСТИ

Подобные состояния переживали и переживают граждане не только Беларуси, но и стран, где хорошо развита медицинская наука. Там накоплен и обобщен опыт борьбы с этими явлениями. Американцы, чьи клиники переполнены больными, у которых ярко выражены симптомы хронической усталости, пришли к выводу, что причиной этого является американский прагматизм, обедненный чувствами. Советуя своим гражданам почаще расслабляться в течение дня хотя бы на несколько минут, медики добились некоторых успехов.

Эксперименты ученых из Колумбийского университета показали, что если люди заняты увлекательным делом, они не чувствуют усталости. Утомляют прагматичная цель, скучная однообразная работа. Как вывод: если ты не можешь найти себе увлекательную работу, постарайся с душой относиться к тому, что делаешь.

Англичане пополняют свои жизненные силы в клубах по интересам. В стране всевозможных клубов правильно нащупали механизм обмена энергией.

Японцы особенно озабочены повышением собственной работоспособности. Они делают все возможное, чтобы не допустить оттока жизненных сил. Ведь при минутном обмене злобными и раздражительными репликами в транспорте или в магазине теряется энергии не меньше, чем при 2-х часовой работе. Поэтому в Японии незнакомый человек, с которым вам приходится вступить в разговор или обменяться взглядами, обязательно тепло улыбнется вам.

Необыкновенно дружелюбная атмосфера царит у японцев в каждом трудовом коллективе. Японцы прекрасно знают, что наибольший приток жизненных сил дает общение с природой. Поэтому не мыслят для себя выходной день без выезда за город, на природу.

ЧТО ДЕЛАТЬ НАШИМ СООТЕЧЕСТВЕННИКАМ

Как общий совет – прекратить неравную борьбу с реальностью. Лучше всего принимать жизнь такой, какая она есть. Когда вы полюбите жизнь, она также полюбит вас. Вы будете чувствовать себя здоровыми и энергичными, если сможете получать от своего окружения любовь, доброжелательность, уважение, сочувствие. Но такого качества энергию вы получите лишь тогда, когда станете излучать из себя такую же энергию теплой любви к окружающему миру и людям, среди которых вы живете. Иначе обмена не получится.

В природе царит закон, который гласит: подобное притягивает подобное. Не надо обижаться, что вокруг вас черствые, бездушные люди. Каждый вращается в своем обществе. Изменится ваш внутренний мир – изменится и ваше окружение.

Наша усталость, которая грозит перейти в хроническую, вызвана не столько отсутствием витаминов, экологически загрязненной средой обитания, сколько всеобщей раздражительностью. Мы выплескиваем из себя море отрицательных эмоций, а потом задыхаемся в этой атмосфере.

Сделайте шаг настречу жизни, улыбнитесь встречной женщине, незнакомому мужчине, набухшим почкам на деревьях, весне – и ваше самочувствие начнет улучшаться.

ПРЕДЛАГАЕМ УПРАЖНЕНИЯ ДЛЯ СНЯТИЯ УСТАЛОСТИ

УПРАЖНЕНИЕ № 1.

Вы берете свечу (лучше церковную), зажигаете ее, садитесь напротив на расстоянии 2-х метров.

Позиция: сидеть в позе дза-дзен (поза на корточках), 10-15 минут. Концентрировать взгляд на кончике пламени, открывать и закрывать глаза. Медитация на свечу очень хорошо восстанавливает работоспособность, снимает усталость глаз, служит профилактикой близорукости, снимает чужие биополя, восстанавливает нервную систему.

УПРАЖНЕНИЕ № 2.

"Освобождение от рюкзака".

Вы вошли в квартиру, закрыли входную дверь. Стоя возле двери, мысленно скидывайте с себя "рюкзак", в котором скопились отрицательные эмоции, конфликты на работе, в транспорте и т.д. Мысленно оставляете этот рюкзак у входа в квартиру.

Занимайтесь новыми делами, не думая о тяжелом рюкзаке. Он вам совершенно не нужен. Он вреден.

УПРАЖНЕНИЕ № 3.

Для выполнения упражнения вы надеваете трико (чистое), расстилаете коврик или подстилку.

Исходное положение: вы садитесь в позу дздзен (поза на корточках). Затем разводите колени и наклоняетесь вперед. Руки впереди туловища. Положили голову на вытянутые руки и расслабились. Мир, добро, покой. Дыхание ровное, спокойное. Упражнение выполняется 3-5 минут. Очень хорошо снимает усталость, восстанавливает нервную систему.

Николай ГОРЧАК

ЖЕЛТОЕ ОБЛАКО

Художник Гавриил Ващенко вырос в приграничье, где Беларусь рекой Припять плавно и незаметно переливается в Украину. В Киевском художественном училище он без труда перешел на украинский язык, считая это своим естественным состоянием. К тому же сама тогдашняя атмосфера Киева требовала говорить по-украински.

После училища ему предложили поступать в Киевский институт, что, конечно же, тешило молодое честолюбие. Но он – отказался. Почему?

Ему было 20 лет, но он уже понял, что главное достоинство человека – независимость. Он провел разведку в Киевском институте, где предстояло учиться, и выяснил, что заведение являет собой часть единого партмеханизма и готовит для данного механизма обслуживающий персонал. Он хотел быть художником, а не прислугой с кисточкой в руке. И потому отправился во Львов. Почему?

Во Львове в конце сороковых еще сохранилась атмосфера европейского города, сопротивляющегося тоталитаризму. В институте прикладного и декоративного искусства работали педагоги, получившие образование в Риме, Париже, Варшаве, Мюнхене. Благодаря им в институте царили свобода и творчество. Двадцатилетний Гавриил Ващенко знал, куда идти.



На снимке: с внучкой Яной, женой и картинами.
Фото Анатолия КОЛЕДЫ

ОН ПОВТОРИЛ ПУТЬ, НАЧАТЫЙ 500 ЛЕТ НАЗАД

Он повторил путь, начатый Скориной пятьсот лет назад. Получив образование в Европе, возвратил талант своему народу.

Однако прежде Ващенко оказался в Молдавии. После окончания Львовского института он стал преподавателем Кишиневского художественного училища.

В Молдове к нему как художнику пришел первый успех. Первые награды. И вместе с ними – тоска по... себе истинному. Он единственный мог дать справедливую оценку своей живописи, своему пейзажу и портрету. Не то! Это – не он! Он никогда не будет молдавским художником, ему уготована участь ремесленника а ля Молдавия.

Это был самосуд. Самоприговор был таков: возвращаться в Беларусь и начинать сначала. С детства, с первой капельки родины.

Возвращение произошло в 1961 году. Он был в возрасте Христа.

***

Итак, детство, первый глоток жизненного опыта: чем отзовется?

В 7 лет от роду ему доверили всех деревенских овец. Он проводил с ними летний световой день, за что родная деревня снабжала его едой, а семье гарантировала пастуший заработок. Овцы напоминали серые облачка, разбросанные по зелени. В грозу овцы сбивались у его ног, и небо падало на их единственного защитника, на маленького человека, уже думающего о смерти.

Детство, как блюдечко, переполнено безотчетной радостью и безотчетной тревогой. На то и другое имеются причины. Человек, поясняющий их, становится поэтом либо художником.

Через три десятилетия он написал картину "Облако". Над нами нависла черно-желтая скала. Вот-вот рухнет, накрыв все живое. Хочется хватать подручный материал и городить подпорки. Чтобы спастись.

Художественный совет рекомендовал картину на коллективную выставку, приуроченную, как было принято, к очередному партийному мероприятию. Худсовет, подстраховавшись, отметил, что "Облако" мобилизует в человеке защитные механизмы и, таким образом, гуманистично по замыслу.

Перед открытием на цензурный просмотр явился номенклатурный чин и приказал убрать это непонятное злое облако, которое испортит у делегатов настроение. Атмосфера в обществе должна быть безоблачной.

В десятке километров от луга, на котором семилетний Гавриил Ващенко пас овец, встал нарядный куб — Чернобыльская АЭС. В 1986 году он перевоплотился в злобное облако и рухнул на родную деревню Чикаловичи.

Малую родину он без устали воскрешает теперь на своих полотнах.

***

Имя Гавриила Ващенко в Беларуси не на слуху прессы, масс и вождей. Имеются погромче имена, выгравированные под многограммными циклами, почетными государственными заказами, политико-художественными прокламациями. Ващенко не пасется вокруг новоявленных лидеров общества, как пасутся иные коллеги, "не борется" за народ на митингах. "У меня другая профессия, -- сказал он мне, -- я художник. Живу тихо, без суеты. Что задумаю – сделаю. Это улучшает настрой, заставляет строить новые планы, идти дальше."

Он стремился в отечество, которое своих художников и поэтов, увы, не почитает. Помните, пару лет назад Международный биографический центр в Кембридже назвал белорусского художника Гавриила Ващенко человеком года? Если бы не газета "Известия", сообщившая об этом событии, Беларусь могла бы не узнать, что имя ее сына внесено в анналы мирового сообщества.

Получив тогда из Кембриджа письмо о присвоении высокого звания, он решил снять пару копий и послать друзьям. В Белорусской академии искусств, где профессор Ващенко заведует кафедрой, копировальный аппарат – под неусыпным контролем проректора. У него надо брать разрешение что-либо скопировать. Профессор Ващенко показал, что. Проректор прочел и буднично молвил: "Поздравляю".

Вскоре в академии состоялось открытие выставки студенческих работ, там заодно поздравили и Человека года. Затем подоспел очередной съезд художников Беларуси, там его тоже поздравили. И тоже – походя.

***

В белорусском отечестве так и не создана традиция понять и оценить своих пророков, поэтов, художников. Белорусское госчиновничество, "отвечающее" за культуру, зачастую не отличает живопись от акварели.

Недавно в мастерскую Ващенко на экскурсию ввалилась группа заведующих отделами культуры райисполкомов. Бегло посмотрев картины, поинтересовались ценой и завязали диспут на тему: "Нужны ли они народу". Сошлись на том, что не нужны. Во-первых, дорого (хотя цена картины в несколько раз меньше цены заурядного ковра, украшающего любое жилище). Во-вторых, народ не поймет, ибо жизнь не такая, как на картинах Ващенко.

Они, судя по всему, хотели сказать, что Ващенко – не реалист. Подметили верно. Его пейзаж (в основном – Полесье) не детализирован и представляет собой образы-символы. Сосна причудливой формы, переходящая в ветер. Исковерканный, но живой дуб-исполин, на который у Белорусского Полесья последняя надежда. Аисты с крыльями-руками, дарующими нам наследников.

У живописца Ващенко не встретишь и "точного" портрета. Он видит и любит людей в романтической дымке, в мягких линиях, повторяющих мягкие линии природы. Конечно же, наш современник "не такой": природу он бесцеремонно хапает, а не ласкает ее нежные черты; на груди у него не легкомысленный шарфик, а звезда Героя; он выше ростом и стать его значительнее. Он не узнбет себя в творениях этого художника.

Неужто не узнает?

***

-- Матильда, это действительно вы?

-- Это я, и никто другой. Мы сорок лет вместе. Он знает меня лучше, чем я сама себя знаю. Я – неуравновешенна, могу засмеяться и тут же – заплакать. А почему – не объяснить...

Картина "Осенние вихри". Фигура женщины в осеннем возрасте. Женщины, ведомой вихрем. Столб вихря соединяет ее и Вселенную.

Матильда – жена Гаврила Харитоновича (просила называть ее именно так).

Я спросил у него:

-- Гавриил Харитонович, вы что, не умеете рисовать звезду Героя Соцтруда?

Он понимающе улыбнулся:

-- Умею, но не могу.

Он счастлив оттого, что не поддался повальному лакированию, устоял перед денежными соцзаказами семидесятых. Матильда мне рассказывала, что на кофточку ей собирали целый год, зато кисти и холст у Гарика были всегда.

Я спросил, что же спасло его как творца. Он подумал и ответил: деревенское воспитание, самостоятельное мышление, атмосфера честности в семье.

Матильда, которая, естественно, знает его точнее, чем он сам себя знает (по традиции всех хороших жен), добавила: его мать была святая женщина; не встретить человека добрее, чем его старший брат, отдававший ползарплаты на учебу Гарика; ей, Матильде, очень повезло, что попала в семью Ващенко, где не терпели лжи; если не лгут в семье, то не лгут и в государстве.

***

Никуда не уйти от вопроса: а солгал ли он в Светлогорске?

В Светлогорском дворце химиков его монументальная роспись (Ващенко, кстати, считается основателем национальной школы монументально-декоративного искусства). Эта роспись вошла в альбомы и энциклопедии социалистического реализма. Апофеоз химии как спасительницы земли и людей. Химия как синоним патриотизма. Вот что висит в Светлогорске.

Кто не желает добра своему народу, тот не его сын. Он, Ващенко, желал. Верил в химию, которая, как известно, вместе с электрификацией составляла суть советской власти. Сюжет такой: женщина играет, как на струнах, на химических нитях, опутавших все планеты солнечной системы; на лугу пасутся лошади, украшенные теми же нитями химволокна; и маленький, на заднем плане, жеребенок, убегающий прочь из заказного сюжета. Спасающийся, возможно. Спасающий жизнь.

Сейчас, когда химия отравила окрест Светлогорска землю и воздух, Ващенко видит в своем жеребенке прошлое предчувствие беды и сегодняшнее прозрение. И, конечно же, чувствует стыд за себя, тогдашнего, верующего в очередной партмиф.

Горько честному человеку, тем более художнику, наблюдать себя как продукт общественно-социальной системы, фарисейской по замыслу, преступной по исполнению. И вряд ли может что-либо возвысить человека больше, чем его собственный взгляд на себя со стороны, на себя вне системы, вне овечьего стада, на себя-Человека, верующего исключительно в свои силы.

Посмотрев на убегающего в будущее жеребенка, Ващенко сказал, что теперь у него больше надежд, чем было в семидесятые.

***

Вы слышали! В нынешней смуте он говорит о надежде и утверждает, что сегодня мы ближе к собственному "Я", чем были вчера, под черным облаком ложного идеала. Сквозь общественно-политическую дребедень он видит нечто такое... Нечто существенное в нашей душе, что понуждает жить. Неужто он знает нас лучше, чем мы знаем себя сами?

НУМАР ЗАВЯРШАЕ КАРЛАС ШЭРМАН

РЭВАНШ МІФАЎ



Грамадства Беларусі штучна ўтрымліваецца ў магнітным полі міфатворчасці. Паспрабуем разабрацца, як гэта робіцца.

Вядома з гісторыі, што міфатворчасць узнікае ў вярхах улады, у мазгавых цэнтрах, якія вызначаюць абалонку паводзінаў, але старанна хаваюць сутнасць уладных учынкаў.

Феномен міфатворчасці з вышыні нябачных кабінетаў, якія амаль ніколі не былі рэзідэнцыяй афіцыйна намінаваных асобаў, абавязкова выклікае сустрэчную плынь міфаў, якія нараджаюцца ў глыбінях грамадства, ствараюць легенду пра ўладу, аўру ўлады, якую люд прымае за рэальнасць, за праўду жыцця. Гэта штосьці накшталт аптычнага падману, і прабіцца скрозь туман навеяных мрояў да грамадскай свядомасці не ўдаецца. Часта здараецца так, што вялікія інспіратары, якія ўдала прыдумалі шараговы міф, знікаюць і забываюцца навекі, а іхнія міфы жывуць альбо вяртаюцца раз-пораз прывідамі настальгіі па нібыта геніяльным кіроўцы, па справядлівым жыцці пры ім, якога і не было.

Адсюль неанацызм, наваксаваныя боты прыхільнікаў Мусаліні і Франка, нарукаўныя, часам стылізаваныя свастыкі французскіх, чэшскіх і расейскіх малойчыкаў, туга тых, хто не прайшоў праз ГУЛАГ, па Сталіне, і ўвогуле прыкрая з'ява неасатрапства, з якім мы звыкліся занадта хутка. Прыгадайма спіс вышэйшых кіраўнікоў кожнай быццам бы суверэннай рэспублікі -- атрымаецца амаль што Палітбюро ў поўным складзе. Нават на ўзроўні раёна назіраецца тое ж самае. І напрошваецца пытанне: ці можна называць будаўніцтвам дэмакратыі тое, што яны нарабілі за апошняе дзесяцігоддзе? А мо гэта і ёсць міф, які зрэшты выкліча сустрэчную плынь паданняў і забяспечыць урачыстае, не прыхаванае вяртанне, а таксама рэванш пад воплескамі натоўпу?

Міфам уласціва мімікрыраваць, хамелеоніцца. Сёння, напрыклад, модна гуляць у сацыял-дэмакратыю, маючы на ўвазе зусім іншае выйсце, выйсце ў нікуды. Калі гэта сапраўды так, то з выратаваннем грамадства спазнілася, як амаль заўсёды. Выкрыццё міфу мяжуе з трагедыяй пакалення "вернікаў".

Перабудова (ці апошняя адліга?) спарадзіла ўласныя міфы: гэта будаўніцтва прававое дзяржавы, галоснасць і штосьці пачварнае з чалавечым тварам. За гэтым міфам праглядваў намер зрабіць касметычную, амаладжальную аперацыю сістэме 1917 года, а сустрэчная плынь творчасці грамадства радасна адгукнулася паданнем аб перамозе дэмакратыі на шостай частцы сушы. Люстра імперыі, праўда, разбілася, але асколкі добра захавалі ўласцівасці мінулага.

Найабсурднейшы міф нашага часу мае кодавую назву: "неабарачальнасць працэсаў дэмакратызацыі". Але працэсы ёсць дынаміка дзеянняў, прычым у любым напрамку, і нават толькі з гэтае прычыны любы працэс па прыродзе сваёй абарачальны. Гэты міф уводзіўся ў свядомасць пад час найвялікшай няўстойлівасці, калі наменклатура "перабудоўвалася". Старыя колы, не змазаныя з таго самага 1917 года, зарыпелі як быццам на новы лад, іншым голасам, але па наезджанай каляіне.

Байкі пра дэмакратыю ледзь прыхоўвалі імкненне да рэстаўрацыі папярэдняй сістэмы. Нават дасведчаны люд з'еў міф ад прагі пераменаў, не папярхнуўся хлуснёй, паверыў ды стварыў уласнае паданне насустрач інспіраванай, асабліва пра адчайную барацьбу з карупцыяй. Між тым, адраджэнне суверэннай нацыі без адраджэння суверэннай асобы і ўзнаўлення нармальнай гістарычнай памяці -- справа пакутлівая, але пры спрыяльных умовах мажлівая, аднак адраджэнне без дэміфалагізацыі -- немагчыма.

Сёння Беларусь ёсць квазіправавая дзяржава. Новы міф, як бы мы ні жадалі, ужо створаны. Цяпер улады выконваюць заканадаўства толькі ў той меры, у якой гэта ім па душы. Мы сведкі рэгрэсіі прававых заваёў, узнікнення новых ці прызабытых старых забаронаў і абмежаванняў, якія, натуральна, супярэчаць заканадаўству і канстытуцыйным нормам. Мы сведкі вынікаў касметычнай аперацыі, якая замест амаладжэння ўсё выразней праяўляе стары выскал дыктату. Міф аб самотніку, якому ўсялякія ворагі замінаюць, далёка не новы і спрычыніў мацнейшыя грамадскія трагедыі XX стагоддзя. На жаль, грамадства не хоча прыгадаць тое, што было з ім раней, цешыцца міфамі і ўласнымі паданнямі, не можа ўцяміць нават сэнс свабоды, бо ўсё яшчэ лічыць сябе свабодным за кратамі старых уяўленняў.

Калі ідзе працэс падмены рэальнасці, міфатворцы адчуваюць, што настае перыяд досыць трывожнай няўстойлівасці, і таму востра рэагуюць на асобныя праявы іншадумства, імкнуцца да звыклай і бяспечнай маналітнасці. Крытычная думка ўспрымаецца як тыповая варожасць. Ад часовай галоснасці да манаполіі на сродкі масавай інфармацыі, якая патэнцыяльна ніколі не знікала, -- адзін крок.

У такіх умовах ствараецца незалежная, грамадская альбо прыватная інфармацыйная прастора, якая ўжо і не марыць аб падтрымцы дзяржавы. Ёй бы стабільнае заканадаўства ды дакладнае, апалітычнае яго выкананне ўладамі. Шкада, носьбіты ўлады дзейнічаюць пад ідэалагічным націскам новага парадку, страчваюць апалітычнасць (калі яна была ім вядома). А Юстыцыя недзе згубіла павязку справядлівасці і добра бачыць, каго трэба судзіць. І дзеля чаго.

ЗАЯВА БЕЛАРУСКАГА ХЕЛЬСІНКСКАГА КАМІТЭТА

Беларускі Хельсінкскі Камітэт выказвае заклапочанасць дзейнасцю выканкама Мінскага Савета, якая абмяжоўвае законныя правы грамадзян. Нічым неабгрунтаваная забарона мітынгу незалежных прафсаюзаў, мірнага шэсця у падтрымку незалежнасці выклікалі напружанасць у грамадстве, пратэст супраць парушэння гарантаваных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь правоў асобы. Уся адказнасць за падзеі 24 сакавіка ў Мінску кладзецца на кіраўніцтва Мінскага гарвыканкама.

Тэндэнцыйнае асвятленне падзей 24 сакавіка, асабліва ў беларускіх электронных сродках масавай інфармацыі, яшчэ раз прадэманстравала ўсяму свету адсутнасць на Беларусі свабоды слова.

Жорсткасць, з якой спецпадраздзяленні распраўляліся з безабароннымі маніфестантамі, не мае сабе роўнай у гісторыі Беларусі. Узброеныя мужчыны ў масках, жылетах, касках ужывалі сілу супраць жанчын і дзяўчат, збівалі дубінкамі, нават старых людзей, разбівалі ў кроў твары. Мы рашуча асуджаем антыгуманныя і антыдэмакратычныя дзеянні сілавых структур, што правакуюць грамадзянскую вайну на Беларусі.

Патрабуем, каб віноўныя у гэтых злачынствах былі пакараныя згодна з Канстытуцыяй і законамі Рэспублікі Беларусь.

26 сакавіка 1996г.

ПЭН-ЦЭНТР ГАНАРУЕ

Пастанова журы

Беларускі ПЭН-цэнтр ганаруе прэміяй імя Францішка Багушэвіча:

спадара **Кастуся Акулу** за кнігу "Змагарныя дарогі", якая таленавіта адлюстроўвае малавядомыя падзеі часоў гітлераўскай акупацыі Беларусі і змаганне беларусаў у войсках антынацысцкага альянсу на абшарах Заходняй Еўропы;

спадара **Уладзіміра Арлова** за кнігу "Таямніца полацкай гісторыі", навукова-мастацкія эсэ якой ствараюць праўдзівую панараму жыцця найстаражытнейшага крывіцкага гораду з часоў узнікнення беларускай дзяржаўнасці і да пачатку XX стагодзьдзя;

спадара **Генадзя Сагановіча** за кнігу "Невядомая вайна", якая доказна і яскрава аднаўляе гістарычную праўду аб вайне 1654-1667 гадоў, калі загінуў кожны другі жыхар тагачаснай Беларусі.

Belarussian human rights newspaper "KRUG" ("CIRCLE")

First Issue Contents
04.1996, Minsk

Галоўны рэдактар Анатоль КАЗЛОВІЧ

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Беларускі ПЭН-цэнтр, Беларускі Хельсінкскі Камітэт

ШТОМЕСЯЧНІК

Пасведчанне № 16

РЭДАКЦЫЙНЫ САВЕТ: Уладзімір Арлоў, Рыгор Барадулін, Лявон Баршчэўскі, Генадзь Бураўкін, Васіль Быкаў (старшыня), Наталля Доўнар, Анатоль Казловіч, Таццяна Процька, Карлас Шэрман

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220034, Мінск, вул. Фрунзе, 5-208, тэл/факс 236-95-73

Тыраж 5.000 экз.

Падпісана ў друк: 3.04.96

Друкарня "Мэджык", Мінск, вул. В. Харужай,13

Кошт свабодны